ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 11 СТУДЗЕНЯ 1939 г. № 2 (416)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПРАЦЫ

Соцыялістычная праца рабочых, сялян, савецкай інтэлігенцыі стварае славу і магутнасць нашай радзіме, з'яўляецца крыніцай шчаслівага жыцця народаў Совецкага Саюза. Натхненне і радасць дае працоўным нашай краіны праца, якая ператварылася «з цяжкога і зазорнага брэмені, якім яна лічылася раней, у справу **гонару**, у справу **славы**, у справу **доблесці і геройства**» (Сталін). І асноўным непарушным законам нашага жыцця з'яўляецца вялікі прынцып соцыялізма: «Хто не працуе, той не есць».

Іншы закон дзейнічаў у мінулым, да Вялікага Кастрычніка, у нас і дзейнічае зараз у капіталістычных краінах—воўчы закон капіталізма, трапна раскрыты А. М. Горкім у рамане «Фама Гардзееў» словамі купца Маякіна: «Жыццё, брат Фама, вельмі проста пастаўлена: ці ўсіх грызі, ці ляжы ў гразі»... Назаўсёды змяла з нашай зямлі гэты звярыны закон Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя. Праца, сумленная праца на сябе, на карысць сваёй соцыялістычнай дзяржавы, на карысць усяго народа — стала асновай нашага жыцця. Устанавіліся новыя, соцыялістычныя адносіны да працы. Совецкі народ выхоўвае і вылучае, атуляючы вялікай любоўю, герояў працы — ударнікаў, стаханаўцаў, якія з'яўляюцца перадавымі, знатнымі людзьмі нашага грамадства.

Вялікай заваёвай соцыялізма з'яўляецца ўстаноўлены ў совецкай краіне працоўны дзень, самы кароткі ў свеце. Тое, аб чым толькі марацъ працоўныя капіталістычных краін, у нас завявана і замацавана Сталінскай Канстытуцыяй. Пераважная большасць рабочых і інтэлігенцыі Совецкага Саюза мае 7-мі і 6-гадзінны працоўны дзень. І абавязак кожнага працоўнага краіны соцыялізма загрузіць працай кожную мінуту свайго самага кароткага ў свеце працоўнага дня.

З 1 студзеня 1939 года ўведзена ў дзеянне гістарычная пастанова СНК Саюза ССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе». Усе працоўныя Совецкага Саюза сустрэлі пастанову з вялікім адабрэннем, з радасцю і здавальненнем. Яна, гэта пастанова, накіраваная на далейшы ўздым дабрабыту працоўных соцыялістычнай краіны, з'яўляецца магутнай зброяй у барацьбе за ліквідацыю дэзарганізаванасці і расхлябанасці, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, у барацьбе супроць летуноў, лодыраў, прагульшчыкаў — парушальнікаў соцыялістычных законаў, свяшчэнных прынцыпаў нашага жыцця.

Работнікі літаратуры і мастацтва Совецкай Беларусі ў асноўнай сваёй масе з'яўляюцца сумленнымі працаўнікамі, аддана працуючымі на карысць нашай соцыялістычнай радзімы. Але ў калектывах работнікаў гэтых галін культурнага фронта ёсць і асобныя дэзарганізатары працы, ёсць праявы неарганізаванасці, злачынных адносін да дзяржаўных сродкаў, парушэнняў працоўнай дысцыпліны.

Укажам толькі некалькі прыкладаў. У нашых драматычных тэатрах ёсць творчыя работнікі, у прыватнасці актрысы, якія многія месяцы і нават па году не атрымоўваюць творчай працы. Гэта — вынік няправільнага камплектавання труп і адсутнасці патрэбных клопатаў аб выкарыстанні творчых работнікаў з боку і кіраўніцтва тэатраў і Упраўлення па справах мастацтваў.

Прагулы творчых работнікаў — рэжысёраў, актораў па віне кіраўнікоў прадпрыемства і ў сувязі з гэтым непрадукцыйнае выдаткаванне дзяржаўных сродкаў яшчэ ў большым памеры, чым у тэатрах, мае месца ў кінастудыі «Совецкая Беларусь».

Прагулы і спазненні да апошняга часу ў тэатрах былі нярэдкай з'явай. І ні дырэкцыя, ні мясцкомы не вялі рашучай барацьбы з дэзарганізатарамі вытворчасці. Аб несумленных адносінах да працы раду творчых работнікаў тэатраў сведчаць існуючыя дагэтуль пагардлівыя адносіны да ўдзелу ў масавых сцэнах, праявы недысцыплінаванасці і нават хуліганства ў часе працы, што мела месца ў Белдзяржрамтэатры і іншых тэатрах. Часам дэзарганізуе працу і само кіраўніцтва тэатра—адсутнасцю патрэбнага планіравання работы і бесклапотнасцю да стварэння нармальных умоў для работы калектыва (Тэатр юнага гледача). Надзвычай лёгкадумна да гэтага часу адносіліся ў тэатрах да падбору кадраў. Не ўрэгуліравана ў тэатрах і сістэма аплаты працы. Шырока практыкуюцца розныя дадатковыя выплаты штатным творчым і тэхнічным работнікам. І гэта патурае рвацтву.

Лятунства, нясцынная цякучасць кадраў мелі месца ў Тэатры оперы і балета і ў Белдзяржрамтэатры (у прыватнасці, у аркестры). Да летуноў і прагульшчыкаў благадушна адносіліся і кіраўнікі тэатраў, і профсаюзныя арганізацыі. Лібералізм у адносінах да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны яшчэ не выкарчаван. Доказам гэтага з'яўляюцца спазненні і зрывы нармальнага працэсу працы, меўшыя месца у Тэатры юнага гледача (парушэнні нармальнага пачатку працы), у Белдзяржрамтэатры (спазненне на выхад у спектаклі актора Бульчыка) і ў іншых калектывах нават зараз, пасля ўступлення ў сілу пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС. Гэтыя ганебныя факты сведчаць аб тым, што ні кіраўніцтва тэатраў, ні профсаюзныя арганізацыі не пачалі сапраўднай большэвіцкай барацьбы за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны.

Неарганізаванасці творчай работы ў тэатрах патурае і тое, што дагэтуль Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР не зацверджаны рэпертуарныя планы.

Няма таксама рашучай барацьбы за выкананне рэпертуарных планаў у тэрмін, за своечасовы выпуск спектакляў. Яркі прыклад гэтага—недапусцімая маруднасць у справе пастаноўкі беларускіх опер Тэатрам оперы і балета БССР. Тэатр не раз вызначаў тэрміны выпуску оперы «Міхась Падгорны», але і сёння яшчэ невядома, калі пастаноўка яе будзе ажыццёўлена.

Падобныя праявы несоцыялістычных адносін да працы ёсць і ў іншых калектывах работнікаў мастацтваў і ў асяроддзі работнікаў літаратуры.

Напрыклад, праўленнем Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР прынята не мала вельмі важных рашэнняў па выкананню пэўных творчых работ (варта прыгадаць рашэнні аб напісанні нарысаў аб дасягненнях рэспублікі за 20 год, аб стварэнні рэпертуару для мастацкай самадзейнасці ды іншае); але прайшлі ўстаноўленыя тэрміны, а работа не была выканана. Чамусьці няма дастатковага кантролю за тым, як габінет маладога аўтара пры праўленні Саюза пісьменнікаў адказвае пачынаючым, кантролю за своечасовасцю і якасцю адказаў, якія даюць кансультанты. Няма кантролю работы кіраўнікоў творчых секцый саюза, з-за чаго застаецца незаўважанай бяздзейнасць асобных секцый,—напрыклад, рускай.

А ці-ж не з'яўляецца грубым парушэннем соцыялістычнай дысцыпліны невыкананне ў тэрмін дагавораў на здачу твораў работнікамі літаратуры і мастацтва, сістэматычнае невыкананне тэматычных планаў і графіка выпуску кніг Дзяржаўным выдавецтвам БССР?

Работнікі мастацтва і літаратуры, горача вітаючы пастанову СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, строга асуджаюць ліберальныя адносіны да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і аднадушна патрабуюць ачышчэння калектываў ад паразітычных элементаў—дэзарганізатараў працы, патрабуюць непрымірымай і рашучай барацьбы з усімі праявамі антынародных учынкаў, барацьбы з дробнабуржуазнай распушчанасцю.

Партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і ўсе грамадскія арганізацыі калектываў работнікаў мастацтваў і Саюза совецкіх пісьменнікаў павінны забяспечыць большэвіцкае выкананне гістарычнай пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, павінны выхоўваць соцыялістычныя адносіны да працы. І гэта—выхаванне соцыялістычных адносін да працы — знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з самай асноўнай і самай адказнай работай—з узбраеннем кадраў нашай інтэлігенцыі марксізмам-ленінізмам.

Большэвіцкая партыя і совецкі ўрад, асабіста таварыш Сталін з вялікай любоўю, па-бацькоўску клапатліва, уважліва і чула адносяцца да развіцця соцыялістычнага мастацтва і літаратуры, да работнікаў гэтых участкаў культурнага фронта, да совецкай інтэлігенцыі. Сведчанне гэтага — атрыманне высокіх званняў і ўзнагарод работнікамі мастацтваў Совецкай Беларусі ў дні святкавання 20-годдзя рэспублікі.

Задача работнікаў мастацтваў і літаратуры Совецкай Беларусі паказаць высокія ўзоры соцыялістычных адносін да працы, ствараючы выдатныя творы ў літаратуры, у тэатры, у музыцы, у выяўленчым мастацтве—творы, вартыя нашай вялікай сталінскай эпохі.

ЗАСТУПНІКАЎ ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ І ЛОДЫРАЎ—ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЦІ

ЗАГАД ПРАКУРОРА СССР

...сувязі з апублікаваным 9 студзеня ...тлумачэннем Соўнаркома СССР, ЦК ...(б) і ВЦСПС аб спагнаннях за ...ненне на работу, пракурор СССР А. Я. Вышынскі разаслаў загад ... мясцовым, чыгуначным, водным і ...ным пракурорам. Ім прапанавана ...цягваць да крымінальнай адказ... кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, цэхаў і аддзелаў, пакідаючых беспакаранымі парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Пракурор СССР загадаў прыцягваць такіх кіраўнікоў або па 109, або па 111 артыкулах Крымінальнага Кодэкса РСФСР, або па адпаведных артыкулах кодэксаў іншых саюзных рэспублік.



Плакат, выпушчаны да 15-ай гадавіны з дня смерці В. І. Леніна.

УСІМ ПАРТЫЙНЫМ І СОВЕЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ, УСІМ БОЛЬШЭВІКАМ, ПАРТЫЙНЫМ І БЕСПАРТЫЙНЫМ, УСІМ ГРАМАДЗЯНАМ СССР

АБ ПРАВЯДЗЕННІ ЎСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) і Совет Народных Камісараў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік падкрэсліваюць велізарнае палітычнае і гаспадарчае значэнне пачынаючагася 17 студзеня г. г. Усесаюзнага перапісу насельніцтва.

Усесаюзны перапіс насельніцтва павінен быць праведзен арганізавана, без адзінага пропуску, без памылак; ён павінен даць поўную і дакладную карціну колькаснасці і саставу насельніцтва СССР.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР абавязваюць усе партыйныя і совецкія арганізацыі забяспечыць усямерную дапамогу работнікам перапісу і прыняць усе неабходныя меры, каб Усесаюзны перапіс насельніцтва быў праведзен узорна.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР заклікаюць усіх партыйных і беспартыйных большэвікоў, усіх грамадзян СССР садзейнічаць работнікам па перапісу насельніцтва ў ажыццяўленні гэтай усенароднай справы.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б).
Совет Народных Камісараў СССР.

8 студзеня 1939 года.

РАСТЛУМАЧЭННЕ
Совета Народных Камісараў Саюза ССР, Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Ўсесаюзнага Цэнтральнага Совета Прафесіянальных Саюзаў
АБ СПАГНАННЯХ ЗА СПАЗНЕННЕ НА РАБОТУ

Пры выданні Пастановы ад 28 снежня 1938 года «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе» СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС у пытанні аб спазненнях на работу выходзілі з існуючай практыкі і дзейнічаючых у прадпрыемствах і ўстановах Правіл унутранага працоўнага распарадку, згодна якім спазненнем лічыцца яўка на работу не пазней, чым на працягу 10—15 мінут пасля пачатку работы, а прыход на работу пасля гэтага часу лічыцца прагулам.

У сувязі з наступаючымі запытаннямі Совет Народных Камісараў Саюза ССР, Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) і Усесаюзны Цэнтральны Совет Прафесіянальных Саюзаў растлумачваюць:

1. Спагнанні за спазненне на работу без уважлівых прычын, якія прадугледжаны артыкулам І Пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС ад 28 снежня 1938 года, павінны прымяняцца за спазненне, не перавышаючае 20 мінут пасля пачатку работы ў прадпрыемстве або ўстанове.

2. Рабочыя і служачыя, якія без уважлівых прычын з'явіліся на работу са спазненнем больш, чым на 20 мінут, да работы не дапускаюцца, лічацца прагульшчыкамі і падлягаюць неадкладнаму звальненню.

Пракурору Саюза ССР дадзены ўказанні аб няўхільным прыцягненні да судовай адказнасці кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, цэхаў і аддзелаў, якія ўхіляюцца ад правядзення адпаведных мер і пакідаюць беспакаранымі парушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

-----o-----

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

ДАРОГА НА МАСКВУ

За Менскам выраслі лясы:
Дубы, бярозы, сасныкі.
Дарог шырокіх паясы
Бягуць між імі нацянькі.

За Менскам лёг прасторны шлях —
Бальшак, утоптаны з вякоў.
Чыя нага тут не ішла
Суровай выпраўкай палкоў?

Ішоў пануры Банапарт,
Баякі кайзера ішлі.
Бясслаўна тысячы салдат
На слаўным тракце палеглі.

Ішлі варшаўскія паны
Шалёным валам белых войск.
Згубілі тут навек яны
І веру воінаў і лоск.

За Менскам вырас гай, сасняк
Узняў высока галаву.
За Менскам лёг вялікі тракт —
Дарога светлая ў Маскву.

Мы сталі тут між сёл, між рэк,
Абапал вольнага пуці,
Каварным ворагам навек
Па гэтым шляху не прайсці!

Мы сталі тут каля крыніц,
Дзе шум і гоман баравы.
Замкнулі мы ад чужаніц
Сваю дарогу да Масквы.

Пасуцца коней табуны.
Пілоты смелыя лятуць:
Народа мужныя сыны
Тут службу верную нясуць.

Бяжыць дарога харастваў.
Стаіць узброены народ.
Красуй, чырвоная Масква,
Красуй, магутнасці аплот!

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

Аб рэалізацыі пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС „Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе“

З велізарным натхненнем і аднадушным адабрэннем сустрэлі працоўныя гістарычную пастанову СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, вынесеную ў адпаведнасці з патрабаваннямі працоўных мас, — якая цалкам адпавядае інтарэсам совецкага народа.

Гэта гістарычная пастанова з'яўляецца дакументам велізарнейшай палітычнай важнасці, накіраваным на заваяванне далейшых перамог соцыялізма як у галіне ўздыму соцыялістычнай вытворчасці, так і ў галіне росту дабрабыту і культуры працоўных мас, абараняючы інтарэсы чэсных, добрасумленных рабочых, служачых і калгаснікаў, стварае ўсе ўмовы для яшчэ больш шырокага росквіту творчай ініцыятывы, вытворчай актыўнасці працоўных, разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху.

Гэта пастанова кладзе канец існаваўшай дробнабуржуазнай ураўнілаўцы ў аплаце водпускаў па хваробе, няправільнаму размеркаванню пуцёвак у дамы адпачынку і санаторыі, прадастаўленні кватэр, спыняе злоўжыванні ў скарыстанні водпускаў па цяжарнасці і т. д.

Яна патрабуе ад усіх партыйных, комсамольскіх, гаспадарчых, профсаюзных кіраўнікоў нястомнай барацьбы за стварэнне ўзорнага парадку на нашых прадпрыемствах і ва ўстановах, устанаўленне працоўнай дысцыпліны, поўнай загрузкі рабочага дня, лепшай арганізацыі вытворчасці і непрымірымай барацьбы з усякага роду парушэннямі.

На сталінскія клопаты аб чэсных тружаніках працоўныя БССР, як і ўсяго Совецкага Саюза, адказалі новым вытворчым уздымам, умацаваннем вытворчай дысцыпліны, большэвіцкай барацьбой за выкананне вытворчых планаў 1939 года.

Аднак, работа асобных прадпрыемстваў і ўстаноў у 1-й дэкадзе студзеня паказала, што прагулы, спазненні на работу і іншыя парушэнні вытворчай дысцыпліны ўсё яшчэ прадаўжаюць мець месца. У радзе выпадкаў дапускаюцца ліберальныя адносіны да злосных зрыўшчыкаў вытворчай дысцыпліны, слаба разгорнута палітычная і масава-растлумачальная работа сярод рабочых і служачых.

Бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Абавязаць сакратароў абкомаў, гаркомаў, райкомаў КП(б)Б разгарнуць палітыка-масавую работу сярод працоўных. Шырока растлумачыць пастанову Соўнаркома Саюза, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, давесці яе да сазнання кожнага рабочага і служачага.

2. Абавязаць сакратароў гаркомаў і райкомаў КП(б)Б да 15 студзеня правесці адкрытыя партыйныя сходы пярвічных партарганізацый, на якіх растлумачыць пастанову СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС ад 28 снежня 1938 г., а таксама пастанову СНК СССР «Аб увядзенні Працоўных кніжак» і распрацаваць практычныя мерапрыемствы па іх рэалізацыі.

3. З 10 па 20 студзеня правесці нараду партыйнага, гаспадарчага і профсаюзнага актыва з дакладамі сакратароў ГК і РК КП(б)Б аб рэалізацыі пастановы Соўнаркома СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, а таксама правесці нараду кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў і профсаюзных арганізацый па рэалізацыі пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС.

4. Абавязаць кіраўнікоў прафесіянальных арганізацый у бліжэйшы час правесці сходы членаў профсаюза, на якіх растлумачыць пастанову Соўнаркома СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, распрацаваць практычныя мерапрыемствы па рэалізацыі гэтага рашэння, разгарнуць выхаваўчую работу сярод рабочых і служачых у мэтах папярэджання парушэнняў працоўнай дысцыпліны.

5. Абавязаць кіраўнікоў партыйных, совецкіх і профсаюзных арганізацый прадпрыемстваў і ўстаноў весці рашучую барацьбу з усімі парушальнікамі працоўнай дысцыпліны і правіл унутранага працоўнага распарадку, з прагульшчыкамі, лодырамі, рвачамі, з усімі, хто нячэсна адносіцца да сваіх працоўных абавязкаў.

6. Прапанаваць абкомам, гаркомам і райкомам КП(б)Б забяспечыць сістэматычную праверку выканання пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе» і рашэння СНК СССР «Аб увядзенні Працоўных кніжак», шырока прыцягваць для гэтай мэты рабочы кантроль нізавых профарганізацый.

Партыйныя арганізацыі павінны дабіцца таго, каб кожны комуніст асабіста паказваў узоры высокай працоўнай дысцыпліны і быў-бы сапраўдным арганізатарам мас у барацьбе за ўстанаўленне большэвіцкага парадку на прадпрыемствах і ва ўстановах.

7. Абавязаць рэдактароў рэспубліканскіх, гарадскіх і раённых газет на старонках друку шырока растлумачваць і асвятляць ход рэалізацыі пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе», а таксама рашэння СНК СССР «Аб увядзенні Працоўных кніжак».

ЦК КП(б)Б заклікае ўсіх рабочых і служачых, усіх партыйных і непартыйных большэвікоў па-баявому ўзяцца за навядзенне большэвіцкага парадку на прадпрыемствах і ва ўстановах БССР. На аснове пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС яшчэ шырэй разгарнуць стаханаўскі рух, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, забяспечыць поўнае выкананне ўсіх вытворчых планаў 1939 года.

Сакратар ЦК КП(б)Б П. ПАНАМАРЭНКА.

-----o-----

Умацаванне працдысцыпліны— важнейшая задача

Пастанову СНК Саюза ССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе» работнікі мастацтваў Совецкай Беларусі сустрэлі з гарачым адабрэннем.

Пры абмеркаванні гэтай гістарычнай пастановы ў Менскім драмтэатры, у Яўрэйскім, Рускім, Оперным тэатрах і іншых калектывах ускрыты шматлікія факты парушэнняў працоўнай дысцыпліны.

Пераважная большасць работнікаў мастацтваў свядома і сумленна адносіцца да сваёй працы. Але ёсць у калектывах і людзі, якія дэзарганізуюць работу, сваімі паводзінамі ганьбяць імя работнікаў мастацтваў.

У калектыве Менскага драмтэатра былі факты хуліганства ў часе рэпетыцый. Многія акторы гэтага тэатра парушаюць працоўную дысцыпліну адмаўленнем ад удзелу ў масавых сцэнах, што адбіваецца на мастацкай якасці спектакляў (напрыклад, «Кацярына Жарнасек»).

Ёсць у асяроддзі актораў і летуны. Былі выпадкі ўходу актораў з Опернага тэатра (акт. Берэзінец і інш.) з-за таго, што ў іншым месцы ім абяцалі на 10-20 рублёў большую стаўку. Нават пасля апублікавання пастановы аб упарадкаванні працоўнай дысцыпліны дырэктар Яўрэйскага тэатра прыняў летуна, які пакінуў Оперны тэатр. Ёсць выпадкі п'янства і хуліганства ў Тэатры оперы, Тэатры музкамедыі (акт. Аксенаў) і іншых калектывах. Нярэдка работнікі тэатраў праяўляюць рвацтва. Напрыклад, у Оперным тэатры штатныя тэхнічныя работнікі патрабавалі спецыяльнай аплаты за пераноску рояля. Яшчэ больш анекдатычны выпадак быў у Тэатры юнага гледача, калі работнік тэатра прад'явіў для аплаты рахунак ...за зроблены выстрал, які быў патрэбен у часе спектакля. Адміністрацыя і мясцкомы часам патураюць падобнаму рвацтву.

Шматлікія зрывы працэсу работы, парушэнні працоўнай дысцыпліны з'яўляюцца вынікам і безадказнай работы адміністрацыі тэатраў. Напрыклад, у Тэатры оперы, ды і ў іншых тэатрах, з-за бяспланавасці, адсутнасці пэўнага раскладу, незабеспячэння патрэбных умоў работы былі зрывы рэпетыцый.

У некаторых калектывах, напрыклад, у Менскім драмтэатры, асобныя акторы не атрымоўваюць творчай работы па году і больш, што выклікае нездаволенасць гэтых актораў і парушэнне імі працоўнай дысцыпліны.

Сярод работнікаў тэатра стала звычаем адрывацца на іншую работу — на радыёвыступленні, на канцэрты—без уліку таго, як гэта адбіваецца на асноўнай рабоце ў тэатры.

Работнікі Менскага драмтэатра, Яўрэйскага і Рускага тэатраў пры абмеркаванні пастановы аб умацаванні працоўнай дысцыпліны зусім правільна патрабавалі неадкладнага ачышчэння калектываў работнікаў мастацтваў ад летуноў, рвачоў, дэзарганізатараў працы.

Большэвіцкае ажыццяўленне гістарычнай пастановы партыі і ўрада, умацаванне працоўнай дысцыпліны—важнейшая задача профсаюзных арганізацый і ўсіх работнікаў мастацтваў БССР.

А. ЗІБІЦКЕР.

Старшыня беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў мастацтваў.

ВЯЛІКІ НАРОДНЫ ТВОР

Вялікі эпічны твор «Пісьмо вялікаму Сталіну ад беларускага народа», напісаны і падпісаны двума мільёнамі працоўных Совецкай Беларусі, пераказаны ў вершах совецкімі пісьменнікамі БССР у дзень 16-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў, з'яўляецца высокамастацкім калектыўным творам беларускага народа. У ім ён словамі народнай мудрасці проста і шчыра расказаў праўду аб сваім жыцці, захапляюча і цёпла выказаў, як гэта можа выказаць толькі шчаслівы совецкі народ, удзячнасць за сваё радаснае, шматаімкнёнае жыццё вялікаму, мудраму свайму другу і роднаму бацьку таварышу Сталіну.

Працоўны народ — вялікі, разумны творац — за часы сваёй шматвяковай гісторыі стварыў нямала неўміручых твораў народнага эпасу, народнай паэзіі.

Беларускі працоўны народ у часы свайго вялікага соцыялістычнага адраджэння стварыў твор, варты сваёй эпохі, варты эпохі пераўтварэння ў дзеянне вялікіх ідэй комунізма.

У шасці частках свайго пісьма таварышу Сталіну беларускі народ расказвае... «праўдзіва быліны аб тым,

Як жылі мы і сталі мы чым,
Як мы разагнулі прыгнутыя спіны,
Сагрэтыя чулым прыглядам тваім».

Беларускі народ прайшоў цяжкі шлях паднявольнага жыцця, на працягу многіх стагоддзяў змагаючыся за сваё вызваленне з літоўскімі магнатамі, нямецкімі псамі-рыцарамі, польскімі вяльможнымі панамі. Беларусь на працягу сваёй гісторыі не раз ператваралася ў руіны, але беларускі народ заўсёды разам з братнімі рускім і украінскім народамі змагаўся за сваё вызваленне супроць агульных ворагаў — і перамог сваіх векапомных ворагаў пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна — заснавальнікаў Совецкай Беларусі, стварыўшы сваю соцыялістычную дзяржаву. Вось чаму наш народ упэўнена заяўляе свайму правадыру:

Мы ўсе згуртаваны адзінаю воляй,
Адзіным пачуццем, жаданнем адным.
Не верне былога ніхто і ніколі,
У прах яно пала і знікла, як дым.

Адышло ў нябыт змрочнае мінулае беларускага народа, знікла галеча і жабрацтва, перастаў гуляць бізун жандара і пана-ката па спінах працоўных, ніколі не вернецца той час, калі:

На абед была нам лебяда з мякінай,
А далей—магіла пад сухой асінай.

Жыццё стала заможным і радасным, «край легенд, крыжоў, магіл, курганоў» ператварыўся ў квітнеючую індустрыяльную краіну — ордэнаносную БССР.

А глянеш на поле, на лес, на
даліны,
Паслухаеш гоман і шум гарадоў...—
Ты стала нам роднаю, наша краіна,
Як родная партыя большэвікоў!

Як праўдзіва, як глыбока, змястоўна і проста, скупымі радкамі выказана ўсё, чым з'ўлялася прамысловасць Беларусі ў мінулым!

Была ў нас індустрыяй—фабрыка
квасу,
А фабрыкай гневу—была ў нас
турма!

Замест маленькіх кузняў, саматужных варштатаў, кулацкіх млыноў і адзінокіх смалярняў у мінулым — у Совецкай Беларусі выраслі гмахі буйнай індустрыі, фабрыкі і заводы ўсесаюзнага значэння. Карэнным чынам змяніліся гарады, мястэчкі і вёскі Беларусі, былой правінцыі царскай Расіі. І пагэтаму зараз:

Старога мястэчка даўно не
спаткаеш,
Дзе гора брыло ад варот да варот.
Мы спадчыну ўпартаю працай
змяняем:
Дзе кузня чарнела—сягоння завод.

Разам з бурным ростам індустрыялізацыі нашай краіны, з паспяховым выкананнем сталінскіх пяцігодак выраслі знатныя людзі Совецкай Беларусі—стаханаўцы і стаханаўкі, сыны і дочкі беларускага народа.

На палі Беларусі прыйшлі складаныя сельскагаспадарчыя машыны, яны змянілі непрыглядны пейзаж краіны, ператварыўшы пяскі і балоты ва ўраджайную глебу, далі магчымасць узрошчваць у Беларусі такія культуры, якіх не ведалі ў мінулым беларусы.

— Беларускі мужык чалавекам
стаў звацца,
Ён пазбыўся навечна нядолі
шнуроў.
Мы за год ад зямлі маем столькі
багацця,
Колькі мелі раней за дзесяткі
гадоў.
— ... Многа новых раслін мы ў
рэспубліцы маем,
Цвет мічурынскіх яблынь над
краем павіс.
Вінаградныя лозы з паўднёвага
краю,
А з усходняга краю прышоў
кок-сагыз.

З непісьменнай, некультурнай, адсталай ускраіны царскай Расіі Совецкая Беларусь стала высокакультурнай перадавой рэспублікай Совецкага Саюза, у якой налічваецца больш двух дзесяткаў вышэйшых навучальных устаноў, больш сотні тэхнікумаў і рабфакаў, тысячы школ, рад навукова-даследчых інстытутаў на чале з Акадэміяй навук БССР. Толькі дзякуючы няўхільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, будаўніцтву культуры, соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме,—

Стала светлай, пісьменнаю наша
краіна,
Забабонаў і прымхаў мы скінулі
груз,
І не крыжык — адзнаку пакутаў і
кпінаў, —
А пісьмо табе піша цяпер беларус.

Беларускі працоўны народ быў заўсёды шчыра аддан сваёй маці-радзіме, заўсёды знаходзіўся ў шчыльнай братняй дружбе з вялікім рускім народам і страсна ненавідзеў і ненавідзіць здраднікаў сваёй радзіме, лакеяў з лагера марыянетачнага «урада» так званай «Беларускай народнай рады», якія лізалі боты нямецкаму кайзеру, Пілсудскаму і іншым шматлікім інтэрвентам, прадаючы Беларусь і беларускі народ агулам і ўраздроб ворагам. Аб гэтых учынках нацыянал-фашыстаў, агентаў германскага і польскага імперыялізма, аб прадажніцкіх здзелках прастытуіраванага «урада» у творы сказана надзвычай праўдзіва:

І паны-нацдэмы з «высокае рады»
Рады, што германцы захапілі ўладу.
Пішуць лісты, пішуць нямецкаму
цару:
— Заставайся, цару, у нас
гаспадарыць.
Народ беларускі аддаем да скону
Ураздроб і оптам пад тваю карону.

Усё пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну прасякнута ідэяй дружбы, непарыўнай шчыльнай сувязі паміж народамі вялікага Совецкага Саюза. Гэта дружба выкоўвалася ў барацьбе народаў СССР супроць полчышчаў інтэрвентаў, супроць белагвардзейскіх банд сапраўдных і несапраўдных царскіх генералаў; гэта дружба ўмацоўваецца на аснове вялікай хартыі народаў краіны соцыялізма — Сталінскай Канстытуцыі. Пагэтаму эпіграфам да вялікага народнага твора з'яўляюцца словы таварыша Сталіна аб дружбе паміж народамі СССР.

Народнасць твора, высокае паэтычнае майстэрства яго заключаецца ў першую чаргу ў тым, што ўвесь працоўны народ БССР прымаў актыўны ўдзел у стварэнні пісьма правадыру. Ён абмеркаваў яго ў чарнавіках і праз сваіх песняроў, літаратараў — совецкіх пісьменнікаў БССР — адшліфаваў так, што ён зазззяў агнямі сапраўды народнага мастацкага слова.

Шчырасць, праўдзівасць у адлюстраванні мінулага і сучаснага Совецкай Беларусі, бязмежная адданасць сваёй радзіме, гарачая любоў да яе, да свайго вялікага і мудрага правадыра, правадыра народаў СССР Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, — вось што, па-другое, надае народнасць гэтаму твору.

Простая паэтычная мова, трапныя мастацкія выразы, так званыя пастаянныя народныя эпітэты і параўнанні, мілагучнасць і напеўнасць верша таксама з'яўляюцца характэрнымі для твора.

Усё — ад радка да радка, ад слова да слова — запамінаецца з гэтага твора, лёгка вывучаецца напамяць.

Вось чаму беларускі народ любіць свой твор, завучвае яго напамяць, вось чаму нашы кампазітары пераклалі твор на музыку, а нашы шчаслівыя школьнікі любяць дэкламіраваць яго.

І ў вуснай народнай творчасці, ствараемай працоўнымі нашай краіны, паасобныя матывы, выразы і мастацка-слоўныя вобразы гэтага твора знайшлі сваё адлюстраванне. Няма сумнення ў тым, што гэты твор беларускага народа аказвае і акажа вялікую паслугу развіццю беларускага фальклору, а таксама беларускай совецкай паэзіі.

У гэтым і заключаецца вялікая сіла мастацкага слова, сіла народнай паэзіі і яе дзейнасць.

Бясспрэчна, што «Пісьмо вялікаму Сталіну ад беларускага народа» атрымала высокую ацэнку не толькі з боку беларускага друку, а і ўсёй партыйнай і совецкай грамадскасці. Прыкра толькі тое, што незаслужана мала беларускімі крытыкамі напісана аб гэтым творы, а больш правільна сказаць — амаль-што нічога не напісана пра лепшы твор совецкай літаратуры БССР.

Трэба думаць, што беларускія крытыкі, навуковыя работнікі — літаратуразнаўцы напішуць аб гэтым творы беларускага народа не толькі звычайныя рэцэнзіі, а і глыбокія навукова-даследчыя працы.

М. КАРПАЧОЎ.

ЯК МЫ ЗБІРАЕМ ФАЛЬКЛОР

Песня ў жыцці чалавека мае вялікае значэнне, яна натхняе яго на працу і змаганне; праз песню чалавек выказвае свае думкі і пачуцці, парывы і імкненні, любоў і нянавісць. Вусная творчасць працоўнага народа — гэта гісторыя яго сапраўднага жыцця. Пагэтаму вельмі важна сабраць усю вусную творчасць, створаную народам на працягу тысячагоддзяў і ствараемую зараз, выдаць яе і вывучыць. Аляксей Максімавіч Горкі, які надаваў вялікае значэнне фальклору, гаварыў: «Сапраўдную гісторыю працоўнага народа нельга ведаць, не ведаючы вуснай народнай творчасці...» І далей: «...Пачатак мастацкага слова — у фальклоры. Збірайце ваш фальклор, вучыцеся на ім».

З гэтага вынікае, што на збіранне фальклору трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу. Вялікая і пачэсная задача ў гэтым сэнсе стаіць перад совецкімі настаўнікамі. Жывучы ў вёсцы, працуючы заўсёды з масамі і сярод мас, працуючы з вучнямі, настаўнік штодзённа чуе сотні прыкладаў вуснай народнай творчасці — песень, казак, частушак, пагаворак, прыказак і інш., але не заўсёды звяртае на іх увагу, не запісвае іх. А трэба звярнуць на гэта ўвагу, тым больш, што на ўроках літаратуры настаўнік часта выкарыстоўвае фальклорныя тэксты, якіх так мала ў хрэстаматыях для няпоўных сярэдніх школ.

Я хачу караценька расказаць, як узяліся за збіранне вуснай народнай творчасці настаўнікі і вучні Паршынскай НСШ, Горацкага раёна. Праходзячы ў пятых класах па літаратуры тэму «Фальклор», я папрасіў вучняў запісаць песні, частушкі, казкі ў сваіх вёсках—ад дзяўчат, калгаснікаў, бацькоў, матак і інш. Вучні з цікавасцю ўзяліся за гэту справу. Праўда, усе пыталіся, якія песні і казкі запісваць—ці толькі совецкія, ці і старыя. Я растлумачыў, што запісваць трэба ўсё, што адлюстроўвае совецкі лад, урачыстасць беларускага народа, што расказвае аб цяжкім мінулым і радасным сёння і нават... аб каханні. Ну, тады мне паваліліся цэлыя сшыткі. Гэту-ж работу я правёў і ў шостых і сёмых класах. Там таксама жыва адгукнуліся на гэта. Зараз вучні прыносяць частушкі штодзень, спаборнічаючы на больш плённы запіс. Дзяўчаты прыносяць прыгожа расквечаныя ўзорамі і кветкамі сшыткі, напоўненыя самымі рознастайнымі частушкамі. Трэба сказаць, што частушак запісваюць больш за ўсё, пэўна таму, што частушка—самы лёгкі і распаўсюджаны жанр фальклору і яго лягчэй запісваць. Лепшымі збіральнікамі фальклору з'яўляюцца вучні А. Салаўёва, Ганна Гарбузова, Багачова Волька, Багачова Поля, Картаўнёва Капя, Новікава, Хмуравіч Павел, Кухарова Люба і інш. Сам я, гутарачы з калгаснікамі, спяваючы з дзяўчатамі на вечарынках, заўсёды запісваю характэрныя і яркія выразы, пагаворкі, прыказкі, частушкі, песні і інш. Гэта вельмі ўзбагачае маю мову як слоўна, так і вобразна.

Я думаю, што трэба-б усім настаўнікам Беларусі заняцца збіраннем вуснай народнай творчасці, гэтым мы зробім вялікую і карысную справу.

Я. ШЧАРБАТАЎ.

Паршынская НСШ, Горацкі раён Магілеўскай вобласці.

М. Л. МІХАЙЛАЎ

Да 110-годдзя з дня нараджэння

Міхаіл Ларыёнавіч Міхайлаў (нарадзіўся 3 студзеня 1829 года) — адзін з выдатных рускіх паэтаў — належыць да ліку людзей, несправядліва пакрыўджаных гісторыяй літаратуры. У 50-х годах мінулага стагоддзя ён быў вядомы як бліскучы паэт-перакладчык, асабліва сваімі перакладамі з Гейнэ. Глыбокі знаток іншакраіннай паэзіі, ён першы пазнаёміў рускіх чытачоў з вершамі Томаса Гуда, Лангфелло, Морыца Гартмана, Тэніссона, з якіх многія, напрыклад, «Белае пакрывала» Гартмана, «Песня аб рубашцы» Томаса Гуда і «Грэнадзёры» Гейнэ, атрымалі шырокую вядомасць.

Прычынай таго, што імя Міхайлава было забыта, з'ўляецца не роўнадушнасць чытачоў, а жорсткасць царскага ўрада, які помсціў Міхайлаву за рэволюцыйную пракламацыю «Да маладога пакалення».



Міхаіл Ларыёнавіч быў цесна звязан з прадстаўнікамі перадавой дэмакратычнай інтэлігенцыі мінулага стагоддзя. Яшчэ ў універсітэце ён пазнаёміўся з Чэрнышэўскім, здружыўся з ім, звязаў свой лёс з лёсам рэволюцыйнай дэмакратыі.

У Пецербургу Міхайлаў працаваў не пакладаючы рук: пісаў апавяданні і аповесці, рэцэнзіі на кнігі, артыкулы аб іншакраіннай літаратуры, шмат перакладаў. З 1852 года ён становіцца сталым супрацоўнікам «Современника», удзельнічае ў ім як белетрыст, паэт, крытык, а пасля як замежны карэспандэнт і публіцыст. Н. А. Някрасаў высока цаніў Міхайлава як пісьменніка і як чалавека. Круг літаратурных знаёмстваў і сувязей Міхайлава шпарка пашыраўся.

Найбольш цеснай дружбай Міхайлаў быў звязан з Н. В. Шэлгуновым. Погляды Шэлгунова на сям'ю, шлюб, роўнапраўе жанчыны, супадаўшыя з поглядамі Чэрнышэўскага, не былі простай фразай. Калі жонка Шэлгунова сустрэлася з Міхайлавым і пакахала яго, Шэлгуноў не толькі не супярэчыў гэтаму, а, наадварот, здружыўся з Міхайлавым яшчэ мацней. Для Міхайлава гэта дружба і каханне былі «зарой адкаўлення». У жыцці Міхайлава гэты перыяд быў перыядам росквіту яго літаратурнай дзейнасці.

Увосені 1856 года Міхайлаў атрымаў камандыроўку на Урал і ў Орэнбургскі край «для даследвання быту жыхароў, што займаюцца морскай справай і рыбалоўствам». Не вачамі бясстраснага этнографа назіраў Міхайлаў карціны уральскага жыцця. «Усюды стараюся, — пісаў ён у пісьме да Шэлгунова ў лютым 1857 года, — па меры магчымасці, гаварыць шчыра, без прыкрас, аб стане краю. Драні няма ліку... Гэта — апісанне багрэння. Баюся, што палавіна яго застране ў цэнзуры».

Міхайлавым запісана шмат башкірскіх паданняў і песень аб башкірскіх «бунтах», аб Пугачове, аб генералу Цыалкоўскім — «тырану і мучыцелю» і г. д.

Рэволюцыйная мысль Міхайлава развівалася няспынна. Нават бляск цэнтральных вуліц Парыжа і Лондана не ўтоіў ад Міхайлава галечы цёмных і ўдушлівых ускраін — «сумных прытулкаў беднасці і распусты». У гэтых «лахмотных кварталах», — пісаў Міхайлаў, — мысль мімаволі спыняецца на дарагой цане, якою купляецца так званая «прамысловая веліч народаў». На шматлюдных вуліцах Сіці Міхайлаў углядаўся ў бледныя твары беспрацоўных. Ім «няма чаго рабіць, ды затое і есці няма чаго. — пісаў ён. — Галодныя і знясіленыя прагнасцю, яны з асаблівай увагай чытаюць налепленыя на вокнах таверняў і сталовых пералічэнні прыгатаваных на гэты дзень супоў і іншай ежы, і прагна глядзяць на раскладзеныя тут прадукты...».

«Госпадзі! — цытуе ён Томаса Гуда; — што гэта, як дораг хлеб, і як дзешавы людское цела і кроў!»

У Лондане Міхайлаў сустрэўся з Герцэнам. Гутаркі з Герцэнам мелі для Міхайлава вялікае значэнне — Герцэн дапамог аформіцца палітычным поглядам Міхайлава, які ў далейшым, пад уплывам Чэрнышэўскага, глыбока ўспрыняў ідэі рэволюцыйнай дэмакратыі.

Пасля звароту ў Расію Міхайлаў з галавой акунуўся ў літаратурную і палітычную дзейнасць. У 1861 годзе, пасля рэформы, ён сумесна з Шэлгуновым напісаў пракламацыю «Да маладога пакалення». Пракламацыя гэта пачынаецца характарыстыкай царскага маніфеста 19 лютага 1861 года: «Гасудар ашукаў чаканні народа — даў яму волю не сапраўдную, не тую, аб якой народ марыў і якая яму патрэбна»... Цар даў «народу волю як міласць, як кідаюць разлабанаму псу сухую костку, каб яго супакоіць на час і выратаваць свае ікры».

За гэту пракламацыю Міхайлаў быў прыгаворан да «12-ці год і шасці месяцаў катаргі з пажыццёвым пасяленнем у Сібіры».

Пераходы ад этапа да этапа, сібірскія сцюжы і рэжым катаргі паклалі 2 жніўня 1865 года паэта ў магілу.

У ліку многіх арыгінальных вершаў Міхайлава, якія знаходзіліся пад забаронай цэнзуры, былі найбольш спелыя, створаныя ім у апошнія годы жыцця. Гэтыя творы і даюць магчымасць меркаваць аб тым, па якому руслу пайшла-б яго далейшая творчасць.

Тэмамі вершаў Міхайлава былі карціны рускай рэчаіснасці, прыгоннай вёскі і горада. З мяккім лірызмам гаворыць ён пра лёс сялянскай дзяўчыны, якую выдалі замуж за нямілага («Груня»), аб цяжкім народным горы і т. п.

Соцыяльная лірыка, насычаная пафасам рэволюцыйнай барацьбы, вострая палітычная сатыра — вось тыя асноўныя жанры, якія толькі пачаў распрацоўваць Міхайлаў. Тонкі лірызм яго зусім не падобны на лірызм сучасных яму дваранскіх, сядзібных паэтаў; гэта — перажыванні і пачуцці тых новых людзей, да пакалення якіх належаў сам паэт: любоў да ўсяго герайчнага, жаданне подзвігаў у імя ўсечалавечага шчасця. Асноўны матыў палітычнай лірыкі Міхайлава — барацьба з гнётам самадзяржаўя, са сваволлем, гэтым «адвечным ворагам усяго жывога». У яго паэзіі інтымная лірыка непарыўна звязана з палітыкай, з пафасам рэволюцыйнай барацьбы, асабістае гора і радасць — з лёсам прыгнечанага народа, у рэволюцыйныя сілы якога Міхайлаў моцна верыў.

У вершы «Смело друзья! не теряйте», які стаў папулярнай рэволюцыйнай песняй, Міхайлаў з верай у перамогу рэволюцыі ўсклікае:

Если погибнуть придется
В тюрьмах и шахтах сырых,
Дело, друзья, отзовется
На поколеньях живых.

Любоў да жанчыны дае яму новыя сілы для прадаўжэння барацьбы:

О, свет всевоскрешающей любви!
Ты, дав на дело мне и на страданье
силы,
Веди меня сквозь мрак моей живой
могилы
И к делу вновь могучим призови!

Калі ў вершах Міхайлава і гучаць ноты тугі, дык узнікаюць яны не ад страты веры ў справу рэволюцыі, а з горкага ўсведамлення, што барацьба ідзе яшчэ вельмі марудна, што перадавыя байцы гінуць, а ў свеце, як і раней, пануе сваволле:

Гроб вчера и гроб сегодня,
Завтра гроб... А мы стоим
И покорно: «власть господня!» —
Как рабы твердим.

Песімістычныя матывы ў лірыцы Міхайлава ўзмацніліся ў годы рэакцыі, калі сам паэт, адарваны ад справы рэволюцыі, паміраў у Сібіры:

И за стеной тюрьмы — тюремное
молчанье,
И за стеной тюрьмы — тюремный
звон цепей;
Ни мысли движущей, ни смелого
воззванья,
Ни дела бодрого в родной стране
моей!

Але сумныя стогны, якія мімаволі вырываліся з грудзей паэта, не патушылі ў ім агню веры ў тое, што надыйдзе дзень, калі засвеціць —

Счастья и довольства
Для народа луч.

Ц. ОСІН.

М. РУХАЎ

ПРАЧЫНАЮЦЦА

Апавяданне

Недалёка ад сталіцы Абісініі размясціўся італьянскі ваенны шпіталь. Шпіталь абслугоўваў паўночную частку італьянскай арміі. Першае тэрапеўтычнае аддзяленне змяшчалася ў чатырох лямцавых шатрах, накрытых брэзентам. Доктар Пасцілло, малады чалавек з даўгаватым жвавым тварам, сядзеў у адным шатры каля стала і выклікаючы аглядаў «хадзячых» хворых.

— Джузеппе Кміно! Ну, здароў?

Малады, смяхотлівы сіцыльянец падыходзіць да стала.

— Зараз на выпіску!

— Я хворы, доктар,—заяўляе Кміно.

— Хворы? Што-ж у цябе баліць?

— Усё!

— Э, ты, бачу я, не хочаш на фронт? Зараз на выпіску!...—Дукаміні,—выклікае доктар другога.

Падыходзіць высокі, хударлявы чалавек з глыбока запалымі вачыма. Доктар хмурыцца.

— Што, кашаль, кроў? — пытаецца доктар.

І кашаль, і кроў... зусім не сплю, — хрыпла шэпча той у адказ.

— На фронт!.. Мабыць, яшчэ паспееш забіць хоць аднаго з гэтых чорных дзікуноў. — Мадрыго! — выклікае доктар наступнага.

— Т-у-т! — адгукаецца ціхім голасам бышы калісьці вясёлым, невысокі, з чорнымі вачыма і жоўтым тварам неапалітанец.

— На фронт! Няма чаго займаць ложак! Ды каб яшчэ была надзея на папраўку, — дадае доктар, — а то... — Джыованні! — кліча ён.

Адказу няма. Малады салдацік, амаль хлопчык, хворы на малярыю, толькі лыпае вялікімі вачыма. Так яго вытрасла трасца. Колькі хіны ён папаглытаў... Але нічога не дапамагае. Кожнага дня ён перш пачынае дрыжаць ад холаду, а потым гарыць як у агні, і, урэшце, абліваецца потам. За час хваробы ён аслабеў да таго, што яму цяжка абазвацца. Ён ужо не верыў ні дактарам, ні кроплям, ні розным лекам. Яму здавалася, што тут ён ніколі не паправіцца. Вось, каб дамоў, туды, у Італію! Але Джыованні ведаў, што ў Італію ён не трапіць, пакуль не скончыцца вайна... Ён думаў: «Каму патрэбна гэта вайна? Што яна дасць, і каму? Начальства кажа, што тут, у Абісініі, шмат золата і розных іншых выкапняў. Але навошта, напрыклад, золата таму чалавеку, які памірае? І нават, калі будзе хто жыць, — ён усёадно гэтага золата не будзе мець. Ён не будзе мець нават падзякі, што ахвяруе сваё жыццё на заваяванне гэтай краіны!

Урэшце, доктар скончыў аглядаць хворых. Фельчар падносіць яму шмат лісткоў на выпіску, якія доктар павінен падпісаць. Потым падносіць запатрабаванне на лекі, на харчы для хворых і весткі аб прыбыўшых і выбыўшых хворых.

— Я, здаецца, выпісаў салол і фенацэцін? Ты-ж чаму не запісаў? — пытаецца доктар у фельчара.

— У аптэцы гэтага няма.

— Да гэтага часу няма? Вось дык справа!.. А вось і сястра!.. У вас, сястра, тыфозныя хворыя без тэмпературных лісткоў! Гэтак нельга!

Міласэрная сястра, маладая дзяўчына з Калабрыйскай правінцыі, загарэлася, кажа:

— Не даюць ні кавалачка паперы.

Сярдзіты доктар скідвае халат, мые сульмой рукі і, ухапіўшы шапку, выходзіць з шатра.

Ці чакаў ён такіх недахопаў?.. Гэтага няма, таго няма... Немагчымыя санітарныя ўмовы, а навакол — смерць!.. А прапановы, каб не затрымліваў хворых, дасылаюцца кожнага дня... Пасцілло сустрэўся з галоўным урачом, які ішоў у тэрапеўтычнае аддзяленне, каб праверыць: ці няма там сімулянтаў, і колькі чалавек адпраўлена на пазіцыі.

У шатрах было ціха. Джыованні пакінула трасца, і яму зрабілася трохі лепш. Ён захутаўся з галавою, але не заснуў. Яму ўяўлялася радзіма — туманная Марэмма з яе сенажацямі і фабрычным смуродам... У яго была вялікая сям'я, але ўсе тры браты былі на фронце. Што там робіцца? Малодшая за яго сястра Піпіта мабыць выйшла замуж. Толькі-ж выходзіць няма за каго. Усіх пагналі на вайну... Ён падумаў пра самую меншую сястрычку, Клару. Старая маці была ўжо слабая, а бацька памёр тры гады назад. Клара павінна падтрымліваць гаспадарку, калі Піпіты няма дома... Бедная дзяўчынка! Ёй толькі пайшоў пятнаццаты год, а яна павінна карміць усю сям'ю. Хто застанецца жывым? Бедная маці! Яна выплакала свае вочы... А падумаць толькі... у імя чаго мы дакаціліся да такога жыцця? Ра-



ней, калі паны бралі нашымі рукамі сабе ўладу, то яны нам, дурням, абяцалі і мір, і любоў паміж людзьмі, і радасць, і шчасце. «У вас будзе, — казалі паны, — такое жыццё... такое жыццё, што нават сам апостал Паўла не прыдумае прыгажэйшага. Мы, паны, будзем даваць капіталы, а вы, рабочыя і сяляне, працуйце з гэтымі капіталамі. Нам, панам, давайце процанты на капіталы, а самі дзяліце прыбытак... Вось якое будзе жыццё!..».

А мы, дурні, развесілі вушы і думаем: «Вось дык Мусаліні! Вось якое ён падносіць жыццё!..»

Прайшлі годы. А цяпер за зямлю, якую мы абрабляем, — плаці панам столькі, што сабе не застаецца нічога. Ядзім гнілы маіс... Нават на макароны ў нас нестае. А цяпер, вось, яшчэ гэта вайна. Каму яна патрэбна?..

У гэты момант прышоў галоўны ўрач. Ён паглядзеў на пасцелі, пачытаў паперы і выйшаў.

На другі дзень, як і заўсёды, доктар Пасцілло аглядаў хворых. Яны доўгаю чарадою праходзілі паўз стол.

Неба — шэрае і хмарнае. Дождж барабаніць аб брэзент шатра, а вецер моцнымі парывамі налятае на яго, быццам хоча парваць на кавалкі. Доктар Пасцілло, хмурны і сярдзіты, робіць сваю справу. Учора ён доўга не мог заснуць і цяпер адчувае сябе дрэнна. Усё яму сёння не падабаецца: сумны дзень, вецер, які не дае выслухоўваць хворых, і самыя хворыя з іх незразумелымі тлумачэннямі. Сёння ён больш, чым звычайна, накіроўвае хворых на перадавыя пазіцыі, а з пятнаццаці чалавек, якія толькі прыбылі, ён большую палову проста накіраваў назад. «Што думаюць тыя ўрачы, якія накіроўваюць людзей з перадавых пазіцый сюды, у шпіталь?..» Так думаў Пасцілло, і ўсю злосць накіроўваў на хворых...

Сумны дзень дрэнна ўплываў таксама і на хворых. Парусінкавыя халаты не баранілі іх ад холаду.

Джыованні сядзіць на ложку і, як заўсёды, думае пра сваіх. Праходзіўшы паўз шацёр хірург Маркані прывітаўся з Пасцілло:

— Дзень добры, калега! Калі вы тут скончыце, прыдзіце, калі ласка, да мяне. Ампутацыі будуць.

Джыованні сядзіць на ложку і прыпамінае знаёмыя малюнкі... І зноў вялікая крыўда і злосць да ўсіх «іх»: да паноў, да начальства, да доктара..

— Джыованні, — выклікае доктар Пасцілло. — Учора таксама тэмпература 40? — пытаецца ён, гледзячы ў тэмпературны лісток.

У гэты момант прыходзіць галоўны ўрач. Ён шпаркім крокам прайшоў па шатру і паглядзеў на пасцелі. Ён у цёплай вопратцы. З-пад казырка блішчаць суровыя чорныя вочы.

— Колькі хворых у аддзяленні? — крычыць ён, яшчэ не павітаўшыся з Пасцілло.

— Дваццаць пяць!

— А на выпіску сёння колькі?

—Пакуль-што прызначыў васьмярых.

— Вась-мя-рых?.. Гэта з дваццаці пяці? Ды вы што?! Шпіталь перапоўнены, а вы тут з імі цацкаецеся... З гэтым што? — спытаўся галоўны ўрач падышоўшы да стала і паказваючы на Джыованні.

— У мяне трасца, ваша...

— Маўчаць! Не з табою размаўляюць... Што з ім? — спытаўся галоўны ў Пасцілло.

Пасцілло моўчкі падсунуў галоўнаму ўрачу тэмпературны лісток Джыованні. Той са злосцю ўтаропіўся на лісток.

Джыованні зусім блізка бачыць шырокі твар галоўнага ўрача, нахмураныя бровы, чырвоную шыю і адчувае, як разгарэлася ў ім крыўда... Яму здавалася, што ад гэтага тоўстага чалавека залежыць яго лёс. Яму хочацца што-небудзь крыкнуць моцна. Але Джыованні стаіць моўчкі, нерухома. Ён не зводзіць сумнага погляду з гэтага чалавека.

Галоўны ўрач адсунуў лісток і павярнуўся да Джыованні.

— Здаравенны хлопец! Ён не сімулянт? — прамовіў ён да Пасцілло, гледзячы ў вочы Джыованні..

— Я гэтага не раблю!.. — не стрываў Джыованні.

— Маўчаць!

Але Джыованні не змаўчаў. Дрыготлівым голасам ён праказаў:

— Тут у гэту сцюжу і здаровы захварэе. І мы ляжым у дадатак галодныя...

— У арыштанцкую! — закрычаў галоўны ўрач, беручы Джыованні за плечы.

Злосць прарвалася ў хворага... Вырваўшыся з рук галоўнага ўрача, Джыованні гарачымі вачыма зірнуў на яго і з усяе сілы даў яму па галаве. Кроў лінула з носу, з роту ўрача. Раз'юшаны Джыованні схапіў табурэтку.

— Стой! — закрычаў Пасцілло.

У гэты момант Джыованні зноў затрэсла трасца. Ён захістаўся і паваліўся.

Пасцілло, нахіліўшыся над паперамі, сядзеў ля стала. Ён не ведаў, што яму рабіць у гэтым выпадку.

Усе хворыя паўставалі са сваіх пасцелей і ў страху глядзелі на здарэнне.

Джыованні калаціўся ад моцнага холаду. Галоўны ўрач, не гледзячы ні на каго, выйшаў з шатра.

Джыованні трымалі як арыштанта, але ў хуткім часе яго судзілі ваенным судом. Прысуду ён не дачакаўся. Калі чыталі прыгавор, — Джыованні быў ужо мёртвы.

Майстры сцэны

Высокая узнагарода, якой Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў актораў Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра ў азнаменаванне дваццацігоддзя БССР, — яскравейшы доказ вялікай сталінскай любві да чалавека, вялікіх клопатаў і ўвагі комуністычнай партыі, усяго совецкага народа да работнікаў нашага соцыялістычнага мастацтва.

Самы каштоўны ў нас капітал — людзі, — у гэтых сталінскіх словах заключан вялікі і ясны сэнс совецкага гуманізма.

Тэатр — гэта акторы, майстры сцэны, здольныя ў цудоўнай мастацкай форме даносіць да шырокіх мас вялікія ідэі комунізма, паказваць праўду жыцця і барацьбы ў яе сёнешнім ці гістарычным аспекце, здольныя абуджаць у нас пачуцці любві да чалавека, да сваёй радзімы, пачуцці нянавісці да ворагаў.

Совецкі актор мае тую шчаслівую асаблівасць, што яго любіць і паважае глядач. Паміж совецкім акторам і яго гледачом моцная, шчырая дружба і сувязь. Гэтая сувязь дапамагае актору творча расці, правільна адлюстроўваць жыццё.

Комуністычная партыя і совецкі ўрад, якія кіруюць работай кожнага нашага тэатра, ствараюць актору такія ўмовы творчага жыцця, якія забяспечваюць яму хуткі рост, поўнае і ўсебаковае развіццё яго здольнасцей.

Акторы Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра пачалі сваю творчую дзейнасць у совецкі час. Толькі адзінкі, як заслужаны артыст БССР Г. Ю. Грыгоніс, пачалі працаваць на сцэне да Кастрычніцкай рэволюцыі — у рускім правінцыяльным тэатры. Аднак, поўнакроўнае творчае жыццё Г. Ю. Грыгоніса таксама пачалося ў Беларускім Дзяржаўным драматычным тэатры. Іменна тут ён набыў сваю папулярнасць, стварыўшы такія яркія сцэнічныя вобразы, як Журдэн у камедыі Ж. Мальера «Мешчанін—дваранінам», Бублік у «Платоне Крэчаце» А. Карнейчука, Савельіч у «Капітанскай дачцы» па А. Пушкіну, дзед Мікола ў «Салаўі» З. Бядулі, Ахрэм у «Кацярыне Жарнасек» М. Клімковіча.

Народны артыст БССР В. О. Владамірскі вырас у беларускім тэатры. З вобраза ў вобраз рос і раскрываўся яго талент, набывалася акторскае майстэрства. У В. О. Владамірскага ў яго практыцы амаль няма шэрых, бескаляровых ролей. З яго інтэрпрэтацыяй таго ці іншага вобраза можна не згаджацца, можна прымаць альбо цалкам абвяргаць увесь створаны ім тып, але ў яго акторскай рабоце заўсёды ёсць смеласць, вайстрыня прыёмаў, яркасць характарыстык і сцэнічных фарбаў.

Іменна такім паказаны Шмага ў «Без віны вінаватыя» А. Остроўскага, Кялямійцаў у «Апошніх» М. Горкага, Пугачоў у «Капітанскай дачцы» па А. Пушкіну, Язэп у «Салаўі» З. Бядулі, Апалон Мурзавецкі ў «Ваўках і авечках» А. Остроўскага, Мухін у «Мосце» Е. Рамановіча і інш.

В. О. Владамірскі — безумоўна найбольш арыгінальны і яркі майстар у калектыве Белдзярждрамтэатра.

Заслужаная артыстка БССР Л. І. Ржэцкая працуе ў тэатры з першых дзён яго існавання. Ёю выканана шмат рознастайных ролей. Сіла драматычнага выканання ў Л. І. Ржэцкай надзвычай вялікая. Трагічны пафас у вобразе Марыны ў «Кацярыне Жарнасек» М. Клімковіча, Каспарыхі ў «Салаўі» З. Бядулі — вельмі высокі.

У вобразе Сакаловай у «Апошніх» М. Горкага Л. І. Ржэцкая вельмі добра перадае вялікую стрыманасць і гордую пагарду гэтай тыповай горкаўскай маці, маці рэволюцыянера, зняволенага царскім урадам. У вонкавым спакоі Сакаловай увесь час адчуваеш вялікі ўнутраны непакой, гнеў і непрымірымую нянавісць да гвалтаўнікоў.

Багата страснасці і сапраўднага драматычнага гучання і ў выконваемай артысткай ролі Кручынінай у «Без віны вінаватыя» А. Остроўскага.

Л. І. Ржэцкая — артыстка рознахарактарная. У яе рэпертуары і Мурзавецкая ў «Ваўках і авечках» А. Остроўскага, і Ліда ў «Платоне Крэчаце» А. Карнейчука, і Фразіна ў «Скупым» Ж. Мальера.

У выкананні Фразіны мы бачым новыя якасці акторскага даравання Л. І. Ржэцкай. Лёгкасць, жвавасць, хуткая змена пачуццяў — бліскуча перадаюць тып свахі ў неўміручай камедыі Ж. Мальера.

Яркі камедыйны талент у заслужанага артыста БССР Г. П. Глебава. Яго арыгінальнае і смелае выкананне Гарпагона ў «Скупым» Ж. Мальера стаіць на высокім узроўні акторскага майстэрства. Маналог аб украдзенай шкатулцы чытаецца Г. П. Глебавым з выключнай сілай камедыйнага гратэску.

Яркія камедыйныя характары створаны Г. П. Глебавым у ролях Чугунова («Ваўкі і авечкі» А. Остроўскага), ксяндза Антонія («Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча), Сверхсметкіна («Як яе завуць» Н. Адуева), Гурэвіча («Вочная стаўка» Л. Шэйніна і бр. Тур).

Акторскі дыяпазон Г. П. Глебава не абмяжоўваецца толькі камічнымі ролямі. Ім створана шмат і драматычных вобразаў.

Заслужаны артыст БССР Б. В. Платонаў працуе ў тэатры з першых гадоў яго заснавання. Яго работы заўсёды вызначаюцца чоткім сцэнічным рысункам, выключнай артыстычнасцю і майстэрствам. Закончанасць і выразнасць сцэнічнай формы не абмяжоўвае, адпак, вялікага акторскага тэмпераменту, якім насычаны створаныя Б. В. Платонавым вобразы — Незнамава («Без віны вінаватыя»), Пятра («Апошнія»), Нікіціна («Жыццё кліча»), Грынёва («Капітанская дачка»).

Тое-ж можна сказаць і аб заслужанай артыстцы БССР О. В. Галіне, артыстцы з высокай тэатральнай культурай. У яе рэпертуары і наіўная, абаяльная Купавіна ў «Ваўках і авечках», і падменная панна Ізабелла ў «Салаўі», і шматпакутлівая, знясіленая Соф'я ў «Апошніх», і мэдам Кіпяткевіч у «Як яе завуць».

Дасканалае выкананне гэтых ролей сведчыць у той-жа час і аб шырокім творчым дыяпазоне актрысы.

Сапраўднае драматычнае дараванне бачым мы ў заслужанай артыстцы БССР І. Ф. Ждановіч. Яе выкананне Веры ў «Апошніх» патрасае выключнай сілай унутранага драматызма. І. Ф. Ждановіч з дасканалым майстэрствам раскрывае перад гледачом складаны ўнутраны свет знявечанай жыццём і асяроддзем юнай Веры.

Шмат цеплыні і абаяльнасці ў выкананні І. Ф. Ждановіч ролі Галі ў «Жыццё кліча», Машы ў «Капітанскай дачцы». Таленавіта створан актрысай вобраз Майкі ў «Платоне Крэчаце».

Заслужаны артыст БССР С. С. Бірыла — актор з вялікім сцэнічным вопытам. У яго значны стаж работы на рускай і беларускай сцэне. Работа над вобразам прафесара Палежаева адкрыла перад ім новыя шырокія перспектывы. Палежаеў у выкананні С. С. Бірылы напоўнен вялікай любоўю актора да гэтага вобраза. У ім трапна знойдзены тыповыя і яркія дэталі, і ён прадстае перад намі выключна багатым, поўнакроўным характарам. Вельмі праўдзіва і па-майстэрску выконвае С. С. Бірыла і ролі—Якава ў «Апошніх», Беркутава ў «Ваўках і авечках», пана Вашымірскага ў «Салаўі».

Асобна трэба сказаць аб Л. Г. Рахленку і М. А. Зораве, якія сумяшчаюць акторскую работу з рэжысурай спектакляў.

Заслужаны артыст БССР Л. Г. Рахленка прышоў у Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр з Ленінградскага інстытута сцэнічных мастацтваў. Выкананыя ім ролі—Кашырына ў «Жыццё кліча» Біль-Белацэркоўскага, Адама Сенчука ў «Салаўі» З. Бядулі — гавораць аб яркай творчай індывідуальнасці Л. Г. Рахленка. Тэма яго вобразаў, яго акторская тэма — моцны, упэўнены ў сябе, мужны, рашучы чалавек, — чалавек-барацьбіт, поўны сілы і страснасці. Крыху ў баку стаяць вобразы Пардэсу ў «Як яе завуць» Н. Адуева, Апалона Мурзавецкага ў «Ваўках і авечках» А. Остроўскага. У іх Л. Г. Рахленка паказаў свае камедыйныя здольнасці.

Л. Г. Рахленкам пастаўлены спектаклі: «Жыццё кліча» Біль-Белацэркоўскага, «Ваўкі і авечкі» і «Без віны вінаватыя» А. Остроўскага, «Скупы» Ж. Мальера, «Партызаны» К. Крапівы і сумесна з заслужаным артыстам БССР Л. М. Літвінавым — «Салавей» З. Бядулі і «Канец дружбы» К. Крапівы.

Л. Г. Рахленка ўзначальвае мастацкае кіраўніцтва Белдзярждрамтэатра.

Заслужаны артыст БССР М. А. Зораў — актор яркіх сцэнічных характараў. Незеласаў у «Бронецягніку» Вс. Іванова, Фурманаў у «Мяцежы» Д. Фурманава, Платон у «Платоне Крэчаце» А. Карнейчука, ксёндз у «Салаўі» З. Бядулі — людзі розных соцыяльных груп, рознага светапогляду, розных характараў. М. А. Зораў знайшоў для выканання кожнага з іх яркія фарбы. М. А. Зораў не паўтараецца ў ролях, ён не баіцца войстрай сцэнічнай формы, эксперыментаў над вобразам.

М. А. Зоравым пастаўлены ў Белдзяржрдамтэатры наступныя спектаклі: «Зямля і неба» бр. Тур, «Платон Крэчат» А. Карнейчука, «Апошнія» М. Горкага, «Вочная стаўка» бр. Тур і Л. Шэйніна, «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча.

За апошнія годы Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр папоўніўся новымі акторскімі кадрамі, якія прышлі з іншых беларускіх тэатраў і з тэатральных вучылішчаў.

Створаны ў 1920 годзе Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр за восемнаццаць год свайго развіцця здолеў выхаваць самае каштоўнае, што ёсць у тэатры, — вялікі акторскі творчы калектыў, няўхільны і хуткі рост якога неаддзялім ад бурнага росту ўсяго нацыянальнага па форме, соцыялістычнага па зместу беларускага совецкага мастацтва.

Е. РАМАНОВІЧ.



Група артыстаў Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета.

На здымку: сядзяць (злева направа): народная артыстка БССР Л. П. Александроўская, галоўны дырыжор-ордэнаносец Н. Б. Грубін, узнагароджаная Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР салістка С. Ю. Друкер, заслужаная артыстка БССР А. В. Нікалаева, заслужаны артыст БССР Л. М. Літвінаў; стаяць (злева направа): заслужаны артыст БССР І. А. Мурамцаў, парторг тэатра П. А. Шмакаў, узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР артыст аркестра Э. Э. Фрыдмо.

УДЗЯЧНЫ ЗА КЛОПАТЫ ВЯЛІКАЙ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

У знамянальныя ўрачыстыя дні святкавання дваццацігоддзя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі мы, работнікі Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета і ў тым ліку ўзнагароджаныя Вярхоўным Советам БССР высокімі званнямі і Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Совета БССР, звяртаемся да выхаваўшай нас партыі Леніна — Сталіна з пачуццём гарачай удзячнасці і бязмежнай адданасці.

Азіраючыся назад, у гістарычнае мінулае, мы бачым, праз якія знявагі і пакуты прайшлі найвялікшыя геніі навукі і мастацтва, якія мелі няшчасце нарадзіцца і жыць ва ўмовах феадальнага і капіталістычнага дэспатызму.

Найвялікшыя геніі навукі і мастацтва — Спіноза, Капернік, Бетховен, Бізэ, Паганіні, Пушкін, Белінскі, Мачалаў, Шчэпкін і шмат іншых гібелі ў нястачы і мучэннях, зацкаваныя духавенствам і дэспатычнай уладай цароў і капіталістаў.

Сучасныя канібалы—фашысцкія ізуверы перасягнулі сваіх «вартых» продкаў у вынаходніцтве сродкаў для знішчэння лепшых людзей і помнікаў навукі і мастацтва. Гэта яны — фашысцкія грамілы — на працягу двух з лішнім год знішчаюць насельніцтва і помнікі мастацтва, бамбардыруючы сонечныя гарады рэспублікамскай Іспаніі, разбураюць геніяльныя тварэнні зодчаства і скульптуры.

Гэта яны — фашысцкія варвары XX стагоддзя — спальваюць неўміручыя тварэнні геніяў навукі—Маркса і Энгельса.

І вось, на фоне беспрасветнай цемрадзі мінуўшых год і сучаснага фашысцкага вандалізма і мракабесся — яркім сонцам узыходзіць новая эра ў гісторыі мастацтва і навукі, — гэта наша совецкае раднснае, шматграннае мастацтва, гэта наша перадавая, усенародная совецкая навука.

У нашай шчаслівай совецкай краіне артысты, музыканты, і ўсе працоўныя інтэлігенты з'яўляюцца роўнапраўнымі грамадзянамі, чые правы замацаваны вялікай Сталінскай Канстытуцыяй.

У нашай краіне званне совецкага інтэлігента і ў прыватнасці актора, музыканта — ганаровае званне.

Мастацтва наша квітнее, як квітнее ўся наша любімая магутная радзіма. Наша беларускае мастацтва пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі развіваецца з кожным днём, і мы, адзін з атрадаў совецкага тэатральнага мастацтва БССР, аддадзім усе свае сілы і энтузіязм для стварэння сапраўды народных твораў, вартых вялікай Сталінскай эпохі.

Ворагі народа, прэзрэнныя шпіёны, дыверсанты, агенты японa-германскага фашызма імкнуліся крывавай рукой затармазіць рост і росквіт беларускага совецкага мастацтва. Ворагі разгромлены. Ліквідуючы рэшткі шкодніцтва на фронце мастацтваў БССР, мы бярэм абавязацельства — пад кіраўніцтвам нашай партыі ў бліжэйшы час стварыць поўнакаштоўныя мастацкія творы, якія адлюструюць гераічную гісторыю беларускага народа і яго шчаслівае сёння («Міхась Падгорны», «Дрыгва», «Салавей», «Кацярына Жарнасек», «Большэвікі граніцы»), і паказаць іх на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Мы ведаем, што фашысцкія бандыты войстраць нажы і рыхтуюцца для нападу на Совецкі Саюз. Але няхай ведаюць і памятаюць фашысцкія бандыты, што па першаму закліку партыі і ўрада армія работнікаў мастацтваў разам з усім совецкім народам грудзьмі стане на абарону свяшчэннай радзімы, змятаючы з твару зямлі ўсіх ворагаў на іх-жа тэрыторыі.

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш любімы друг, наш вялікі правадыр і натхніцель таварыш Сталін!

По даручэнню мітынга падпісалі: народная артыстка БССР АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ, заслужаныя артысты БССР ДЗЯНІСАЎ, МУРАМЦАЎ, НІКАЛАЕВА, ВАСІЛЬЕВА, узнагароджаныя Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР ДРУКЕР, МАЛЬКОВА, ФРЫДМО, рэжысёр тэатра — заслужаны артыст БССР ЛІТВІНАЎ, галоўны дырыжор тэатра— ордэнаносец ГРУБІН, парторг тэатра ШМАКАЎ, дырэктар тэатра ГАНТМАН.

БУДЗЕМ ЯШЧЭ ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ

Выказваю сваю глыбокую ўдзячнасць партыі і ўраду, якія аказалі мне вялікі гонар, узнагародзіўшы мяне званнем заслужанага артыста рэспублікі.

Няма большага шчасця для мастака, чым служэнне свайму народу, служэнне ідэям вялікай партыі Леніна — Сталіна. Будзем яшчэ лепш працаваць, аддадзім усе свае сілы і здольнасці для таго, каб яшчэ вышэй узняць беларускае соцыялістычнае мастацтва, якое з'яўляецца неад'емнай часткай мастацтваў народаў СССР.

П. С. МАЛЧАНАЎ.
Заслужаны артыст БССР.

МЫ РАСЛІ РАЗАМ З ТЭАТРАМ

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб наданні мне звання заслужанага артыста БССР напоўніў маё сэрца вялікай радасцю і хваляваннем.

Я і мае таварышы, якія атрымалі высокія нагароды, раслі разам з нашым тэатрам, у шчыльнай, дружнай таварыскай рабоце з усім калектывам. Рост усяго калектыва тэатра, удасканаленне яго майстэрства, штодзённыя клопаты комуністычнай партыі і ўрада аб тэатры стварылі такую атмасферу, у якой мы змаглі творча ўмацоўвацца і расці. Прымаючы вялікую нагароду, я абавязуюся яшчэ лепш працаваць на карысць нашай соцыялістычнай радзімы.

Я ад усяго сэрца дзякую партыі і ўраду за вялікія клопаты і ўвагу да нас — працаўнікоў мастацтва, за стварэнне ўмоў для нашага няспыннага творчага росту.

П. Н. СЯРГЕЙЧЫК.
Заслужаны артыст БССР.

ТВАРЫЦЬ НА КАРЫСЦЬ НАРОДА

Указамі Вярхоўнага Совета БССР у азнаменаванне дваццацігоддзя Беларускай ССР сотні прадстаўнікоў соцыялістычнай працы, навукі і мастацтва адзначаны высокімі нагародамі.

Мы поўны сардэчнай удзячнасці партыі і ўраду, якія адзначылі нагародамі нас — работнікаў Рускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР.

Высокія нагароды ўскладаюць на нас адказны абавязак — не спыняцца на дасягнутым, а імкнуцца да новых і новых творчых дасягненняў. Мы з вялікай радасцю аддадзім свае сілы і здольнасці на служэнне нашаму народу.

Д. ОРЛОЎ.
Заслужаны артыст БССР.

15 год шэфства работнікаў мастацтваў над Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам

СЛАЎНАЯ ДРУЖБА

Споўнілася 15 год культурнага шэфства работнікаў мастацтваў над Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам. Гэта шэфства нарадзілася яшчэ ў гады грамадзянскай вайны, калі ва ўмовах франтавой абстаноўкі работнікі мастацтваў выконвалі ў часе кароткіх адпачынкаў між баямі рэволюцыйныя песні, давалі спектаклі і гэтым натхнялі байцоў на новых перамог.

Многія з работнікаў мастацтваў асабіста ўдзельнічалі ў гераічных паходах Чырвонай Арміі.

У агні баёў грамадзянскай вайны нарадзілася, а ў далейшым няспынна расла і ўмацоўвалася слаўная дружба работнікаў мастацтваў з Чырвонай Арміяй.

Зараз няма ні аднаго мастацкага калектыва, ні аднаго тэатра, які не вёў-бы сталай шэфскай работы ў часцях Чырвонай Арміі.

Амаль кожны месяц тэатр паказвае свае спектаклі для байцоў, камандзіраў, палітработнікаў і іх сем'яў. І заўсёды кожны актор з пачуццём вялікай радасці і задавалення выступае перад гэтай чулай, уважлівай аўдыторыяй.

Тэатр не абмяжоўваецца паказам спектакляў толькі ў сваім памяшканні. Ён сістэматычна арганізоўвае выезды творчых брыгад для правядзення канцэртаў непасрэдна ў вайсковых часцях.

Ганаровую шэфскую работу тэатр праводзіць і ў часе сваіх летніх гастроляў — паездак у братнія рэспублікі. Улетку мінулага года ў Одэсе тэатр арганізаваў сустрэчу з чырвонафлотцамі Чорнаморскага флота і ваеннаслужачымі. У Кіеве, Харкаве і іншых гарадах братняй Украінскай ССР тэатр выязджаў непасрэдна ў ваенныя лагеры і там паказваў байцам свае лепшыя спектаклі. Вялікую работу правёў тэатр у часе прызыўной кампаніі, абслугоўваючы прызыўныя ўчасткі.

Многія члены нашага калектыва вядуць актыўную шэфскую работу, дапамагаючы гурткам чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Сувязь з Чырвонай Арміяй для нас, работнікаў мастацтва, — вялікая палітычная школа. Гэта сувязь узбагачае нас, актораў, і дапамагае нам у стварэнні патрыятычных вобразаў—вобразаў людзей нашай вялікай эпохі. Дружбу з Чырвонай Арміяй, наша шэфства патрэбна яшчэ больш мацаваць, яшчэ шырэй разгортваць.

Нам — творчым работнікам Белдзяржрдамтэатра — трэба больш актыўна дапамагаць чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, а нашым падшэфным — работнікам Чырвонай Арміі — трэба паставіць абаронную работу ў калектыве нашага тэатра так, каб у гэтай галіне наш тэатр быў першым сярод тэатраў ордэнаноснай БССР.

Няспынна ўмацоўваць вялікую дружбу работнікаў мастацтваў з Чырвонай Арміяй — наш пярвейшы абавязак.

В. О. ВЛАДАМІРСКІ.
Народны артыст БССР.

Шэфская работа Філармоніі

Дзяржаўная Філармонія БССР з першых-жа дзён сваёй арганізацыі (красавік 1937 года) устанавіла цесную сувязь з Чырвонай Арміяй, дапамагаючы разгортванню культурнай работы ў часцях і, у прыватнасці, гурткам чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Аб значнай рабоце Філармоніі, праведзенай за гэты час, сведчыць тое, што пры падвядзенні ў лютым 1938 года вынікаў шэфскай работы за Філармоніяй прызнана першынство.

У радзе гарадоў і раёнаў рэспублікі, дзе-б толькі ні гастраліравалі калектывы Філармоніі, яе эстрадныя брыгады—яны заўсёды ўстанаўлівалі сувязь з часцямі Чырвонай Арміі, арганізуючы шэфскія канцэрты, дапамагаючы сваім вопытам, матэрыяламі і метадычнымі ўказаннямі гурткам мастацкай самадзейнасці.

Хор Філармоніі з сакавіка 1938 года да студзеня 1939 года даў 15 шэфскіх канцэртаў, якія атрымалі добрую ацэнку слухачоў — байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Хор даў таксама некалькі канцэртаў для прызыўнікоў. Ансамбль песні і пляскі даў за гэты час 19 шэфскіх канцэртаў, аркестр народных інструментаў — 16. Адзін канцэрт для ваеннаслужачых Менска даў сімфанічны аркестр разам з хорам.

Калектывы Філармоніі заўсёды з вялікай радасцю выступаюць на шэфскіх канцэртах, ведаючы, што больш чулай, больш уважлівай і ўдзячнай аўдыторыі цяжка знайсці.

Задача Філармоніі да 21-й гадавіны слаўнай Чырвонай Арміі яшчэ больш замацаваць гэту вялікую дружбу, яшчэ цясней звязацца з Чырвонай Арміяй— любімым дзецішчам совецкага народа.

І. Б.

ВЯЛІКАЕ ШЧАСЦЕ СЛУЖЫЦЬ РАДЗІМЕ

Толькі ў нашай соцыялістычнай краіне, якая квітнее пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, адкрыт шырокі шлях для росквіту народных дараванняў, для росквіту соцыялістычнага мастацтва. Толькі соцыялістычная радзіма дала мне магчымасць вучыцца і выявіць свае здольнасці. Нездарма ў нас спяваюць песню: «Что мечталось и хотелось, то сбывается...» Вялікае шчасце — служыць свайму народу, сваёй роднай большэвіцкай партыі.

З дарагім і любімым імем Сталіна у сэрцы, з імем правадыра, які натхняе совецкі народ на геройства і подвігі, упарта авалодваючы большэвізмам, будзем яшчэ больш і лепш працаваць на карысць нашай радзімы, на карысць нашага шчаслівага народа.

Вялікі дакумент Сталінскай эпохі — «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» натхняе, вучыць і заклікае нас да яшчэ больш упартай і плённай работы.

Бясконца ўдзячна партыі і ўраду за высокую нагароду, за клопаты, якімі атулены ў нашай краіне работнікі мастацтваў.

Р. Н. КАШЭЛЬНІКАВА.
Заслужаная артыстка БССР.

ТВОРЧЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

Комуністычная партыя і совецкі ўрад у дні 20-годдзя БССР адзначылі многіх работнікаў навукі і мастацтваў наданнем ім высокіх званняў і ўзнагароджаннем Граматамі Вярхоўнага Совета БССР.

Апраўдаць давер'е і вялікія клопаты партыі і ўрада, апраўдаць наданне нам ганаровых званняў мы павінны творчай працай.

Я стаўлю сваёй мэтай, няспынна ўзбагачаючыся агульнай культурай і авалодваючы майстэрствам, выканаць узятыя мною творчыя абавязацельствы.

Да вясны 1939 года я мяркую закончыць групу «Ленін і Сталін» для цэнтральнай залы павільёна БССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Я імкнуся паказаць вялікіх правадыроў — тварцоў шчаслівага жыцця народаў вялікага Совецкага Саюза і вялікую асабістую дружбу Леніна і Сталіна.

Другая работа, якую я закончу да 22-й гадавіны Кастрычніка, — скульптура «Таварыш Сталін рэдагуе маніфест аб утварэнні БССР».

Трэцяй маёй работай будзе група «Ленін, Сталін, Свердлоў, Дзяржынскі».

Над выраіпэннем гэтых адказных творчых задач буду я працаваць у 1939 годзе.

З. АЗГУР,
Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

РАДАСНА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

У такой краіне, як наша, дзе праца—справа гонару, дзе працу высока цэняць, — радасна працаваць, жыць і тварыць на карысць сваёй радзімы, у якой кожны чалавек сагрэт сталінскімі клопатамі.

Н. П. ЗВЕЗДАЧОТАЎ.
Заслужаны артыст БССР.

ЭКСПАНАТЫ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ БССР ДЛЯ ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ

Дом народнай творчасці БССР пачаў збіранне экспанатаў народнай творчасці для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. Адабрана ўжо звыш 120 экспанатаў ткацтва, вышыўкі, інкрустацыі і жывапісу. У ліку гэтых экспанатаў — работы калгасніц М. Ліпай, А. Пакроўскай, А. Марчанка, А. Маньковай, М. Люштык, А. Сямашка, У. Лясніцкай, П. і В. Крупенкіных, А. Гук і інш., інкрустацыя Гебелева (завод імя Молатава) і інш. Збіранне экспанатаў прадаўжаецца.

Самадзейныя мастакі рыхтуюцца да выстаўкі з вялікім энтузіязмам. Многія з іх працуюць над новымі рэчамі.



Артысты Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра — заслужаныя артысты БССР: С. С. Бірыла, О. В. Галіна, Г. П. Глебаў, Л. І. Ржэцкая, Л. Г. Рахленка, І. Ф. Ждановіч, Б. В. Платонаў, Г. Ю. Грыгоніс, М. А. Зораў.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПЕСНЮ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і аргкамітэт Саюза совецкіх кампазітараў БССР абвясцілі конкурс на лепшую песню, прысвечаную правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Конкурс на лепшы тэкст песні прадоўжыцца з 15 студзеня да 15 красавіка 1939 года, конкурс на музыку да прынятых тэкстаў — з 25 красавіка да 25 жніўня 1939 года.

Умовы конкурса вызначаюць, што тэкст песні павінен паказаць ролю Леніна і Сталіна, як арганізатараў беларускай дзяржаўнасці, адлюстраваць перамогі беларускага народа на франтах социялістычнага будаўніцтва, любоў і беззаветную адданасць беларускага народа вялікаму Сталіну. Змест тэкста павінен быць глыбока ідэйным, простым, лёгка запамінаючымся, зручным для перакладу на музыку.

Музыка песні павінна быць высокамастацкай, бадзёрай, лаходчывай, з напеўнай, лёгка запамінаючайся мелодыяй. Музыка можа быць напісана як для сола з суправаджэннем фортэп'яна, сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў, так і для двух - трох- і чатырохгалосага хора альбо капелы.

Конкурс закрыты. Тэксты і музыка да іх перасылаюцца ва Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР у закрытых канвертах з паметкай «На конкурс песні» і з дэвізам аўтара. Прозвішча, імя, імя па бацьку, месца работы і адрас аўтара павінны быць паказаны ў другім закрытым канверце.

Аўтары лепшых твораў прэміруюцца. Устаноўлена шэсць прэмій: тры — 5.000, 3.000 і 2.000 руб. за лепшыя тэксты і тры — 7 000, 5.000 і 3.000 руб. за лепшую музыку.

Асобныя тэксты і музыка да іх, не адзначаныя прэміямі, але прызнаныя журы добрымі, будуць набыты Упраўленнем па справах мастацтваў па існуючых тарыфах альбо па дагаворанасці з аўтарамі.

Конкурс сустрэчан пісьменнікамі і музычнай грамадскасцю з вялікім энтузіязмам. Многія беларускія паэты працуюць ужо над тэкстамі песень, прысвечаных вялікаму Сталіну.

У ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ССПБ

9 студзеня адбыўся адкрыты сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Першым пытаннем на сходзе была разгледжана заява паэтэсы, сакратара комсамольскай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. Эдзі Агняцвет (Каган) аб прыёме яе кандыдатам у члены КП(б)Б.

Выступаўшыя тт. Клімковіч, Лынькоў, Стаховіч, Гусеў, Шведзік, Броўка і інш. ахарактарызавалі Эдзі Агняцвет як актыўную комсамолку і грамадскую работніцу, паказаўшую добрыя ўзоры грамадскай работы, асабліва ў часе выбараў у Вярхоўны Совет БССР і па наладжванню работы комсамольскай арганізацыі пісьменнікаў. Выступаўшыя таварышы таксама адзначалі і яе творчы рост. За апошні час Эдзі Агняцвет напісала паэму «Фелікс Дзержынскі» і рад добрых вершаў. Зараз паэтэса працуе над новай паэмай. Усе выступаўшыя выказалі думку, што Эдзі Агняцвет сваёю дзейнасцю заслужыла права быць у радах большэвіцкай партыі і што ўступленне ў партыю абавязвае яе яшчэ больш актыўна працаваць і авалодваць паэтычным майстэрствам.

Партарганізацыя прыняла Эдзі Агняцвет кандыдатам у члены КП(б)Б.

Сход партыйнай арганізацыі заслухаў і абмеркаваў справаздачны даклад старшыні групкома Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. Варашылава. Па дакладу выступілі тт. Барысаў, Кунькоў, Мазо, Броўка, Лынькоў, Вярхоўскі, Клімковіч, Бутэлін, якія жорстка крытыкавалі работу групкома. Выступаўшыя ўказвалі на адрыў групкома ад членаў профсаюза, на парушэнне дэмакратыі (ні разу не было справаздачы групкома на агульным сходзе членаў профсаюза). Групком не вёў палітвыхаваўчай і культмасавай работы сярод членаў профсаюза і іх сямей. Аб палітычнай блізарукасці групкома сведчыць тое, што групком нават не пазнаёміў членаў профсаюза з пастановай ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выхадам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Тав. Варашылаў яўна не справіўся з работай па кіраўніцтву групкомам. Работа групкома ССП БССР і яго старшыні тав. Варашылава прызнана нездавальняючай.

Сход адзначыў слабае кіраўніцтва партыйнай арганізацыі групкомам. Вырашана зрабіць у студзені датэрміновыя перавыбары групкома. Групкому прапанавана скласці план работы і ў аснову сваёй дзейнасці пакласці ажыццяўленне пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС аб умацаванні працоўнай дысцыпліны.

ЛІТГУРТОК ПРЫ ПЕДВУЧЫЛІШЧЫ

Пры Рагачоўскім педвучылішчы арганізаван літаратурны гурток, у якім удзельнічае 60 студэнтаў. Праведзены два заняткі гуртка, заслуханы даклады аб жыцці А. С. Пушкіна у сяле Болдзіна. У праграму заняткаў гуртка ўваходзяць даклады аб жыцці і творчасці Ламаносава, Талстога і іншых класікаў, а таксама аб творчасці совецкіх пісьменнікаў.

Таварышы, якія пішуць свае вершы і апавяданні, стварылі творчую групу. На яе занятках распрацоўваюцца пытанні тэхнікі вершаскладання, тэорыі літаратуры, разбіраюцца творы паасобных студэнтаў. Гурток выдае літаратурную газету, у якой змяшчаюцца вершы і апавяданні саміх гуртковцаў. Асабліва часта змяшчаюць свае вершы студэнты Сімкін і Траян. Літаратурная газета мастацка аформлена.

НАВІЦКІ.

У праўленні ССПБ

8 студзеня праўленне ССПБ слухала справаздачы аб выніках курсаў-канферэнцыі маладых пісьменнікаў, якая была склікана праўленнем ССП СССР у Маскве. Ад ССПБ на курсы былі камандыраваны празаік Ул. Кандрацеля, паэт П. Панчанка, крытык Г. Бярозкін.

Тт. Кандрацеля і Бярозкін падрабязна расказалі аб творчых сустрэчах з рускімі пісьменнікамі, дзеячамі мастацтваў, падзяліліся ўражаннямі ад наведвання лепшых тэатраў і музеяў Масквы. Усё гэта ўзбагаціла маладых пісьменнікаў новымі ведамі, дало ім вялікую творчую зарадку. Канферэнцыя дала магчымасць сустрэцца маладым пісьменнікам нацыянальных рэспублік, бліжэй пазнаёміцца з братнімі літаратурамі.

Выступаўшыя ў абмеркаванні справаздачы тт Я. Колас, М. Лынькоў, А. Кучар адзначылі каштоўнасць мерапрыемства ССП СССР. Скліканне маладых пачынаючых пісьменнікаў на канферэнцыі і сустрэчы іх з нашымі сталымі пісьменнікамі, з работнікамі навукі і мастацтва неабходна практыкаваць і праўленню ССПБ.

Выступаўшыя выказалі даволі слушную думку аб тым, што беларускія пісьменнікі, не толькі маладыя, а і старэйшыя, маюць вялікую патрэбу ў больш рэгулярных сувязях з работнікамі літаратуры і мастацтва Масквы, Ленінграда і братніх рэспублік. Той факт, што многія пісьменнікі не бачылі пастановак МХАТ, не былі ў лепшых тэатрах сталіцы, прычым сярод іх шмат такіх таварышоў, якія маюць непасрэднае дачыненне да тэатральнай культуры, пішуць п'есы,—сведчыць аб ведамственай, правінцыяльнай абмежаванасці нашага літаратурнага асяроддзя.

Гэта абмежаванасць і замкнутасць пачынае уваходзіць у нейкую традыцыю. Рэчаіснасць для многіх пішучых наогул не выходзіць за межы Дома пісьменніка і сваёй кватэры. Нават пры шматлікіх магчымасцях выязджаць у гарады і раёны, на заводы і фабрыкі, у калгасы рэспублікі, асобныя пісьменнікі ўсё-ж аддаюць перавагу сваёй прывычнай жыццёвай каляі.



Катанне дзяцей на лыжах.
Фото-эцюд.

Побач з гэтым было ўзнята пытанне аб ажыўленні работы клуба пісьменнікаў. Перайменаванне яго ў клуб работнікаў літаратуры і мастацтва нічога новага не ўнесла ў яго дзейнасць. Па-ранейшаму тут пануе запусценне. Аднак, гэта надзённае пытанне так і засталося нявырашаным, яго непрыкметна абмінулі. І не толькі таму, што афіцыйна яно не стаяла на абвестцы дня, а хутчэй таму, што гэтаму не спрыяла сама атмасфера пасяджэння. Многія члены праўлення, ды і самі пісьменнікі, прывыклі ўжо да таго, што пасяджэнне праўлення — гэта проста чарговая павіннасць, адбыць якую даволі лёгка: прыйсці, пасядзець, прагаласаваць за энную рэзалюцыю. Зусім не абавязкова загадзя падрыхтавацца, прадумаць пытанне, нават не абавязкова ясна выказаць думку.

Так, гаворачы аб захапленні пісьменнікаў тэмай барацьбы з шпіёнамі і дыверсантамі, тав. Бярозкін тлумачыў гэта «модай», «попытам рынку». Гэты «ортадаксальны» вывад — не што іншае, як зневажанне нашага чытача, як пагарджэнне актуальнай тэмай нашай літаратуры. Совецкі пісьменнік распрацоўвае яе не ў залежнасці ад нейкага «сезона», як гэта ўяўляе сабе тав. Бярозкін, а таму, што тэму гэту ставіць перад ім наша рэчаіснасць, таму, што яна хвалюе ўвесь совецкі народ. Пісьменнік не можа абыйсці яе, яго грамадзянскае пачуццё выклікае неабходнасць распрацоўваць яе. Праўда, якаснае вырашэнне любой тэмы вымяраецца тым, наколькі глыбока пісьменнік пранікнуўся ёю, наколькі яна стала яго ўласнай тэмай. Вось, у высвятленні гэтага і заключаецца задача нашай крытыкі. Калі тав. Бярозкін хацеў выказаць падобную думку, дык трэба было паклапаціцца аб яе чоткасці і яснасці, аб адказнасці за свае словы перад аудыторыяй.

Трэба сказаць, што ў нас даволі часта на падобных пасяджэннях дзелавую атмасферу падмяняюць відзімасцю «сяброўскай», беспрынцыпнай атмасферы, якая і прыводзіць да сямейнага, а часам проста безадказнага вырашэння пытанняў дзяржаўнага значэння. Так атрымалася на гэтым пасяджэнні з абмеркаваннем справаздач пісьменнікаў аб напісанні нарысаў для падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Важнейшае мерапрыемства — выданне для нашых школ падручніка, якога яны чакаюць на працягу доўгіх год, апынулася пад пагрозай зрыву. Асобныя пісьменнікі, як тт. Крапіва і Глебка, нават не прыступалі да работы над даручанымі ім артыкуламі. Праўленне, размеркаваўшае тэмы падручніка поўгода таму назад, сабралася праверыць выкананне работы тады, калі патрэбна ўжо здаваць падручнік у друк.

***

У сувязі з святкаваннем у маі бягучага года 1000-годдзя з дня стварэння вялікага народнага армянскага эпаса «Давід Сосунці» праўленне выбрала камісію па падрыхтоўцы да юбілея ў складзе тт. Я. Коласа, І. Гурскага, П. Броўкі, Г. Камянецкага, А. Стаховіча.

ТАМАРА ХАНУМ

7 студзеня ў Менск прыехала народная артыстка Узбекскай ССР, ордэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Совета УзССР — Тамара Ханум.

Тамара Ханум — адна з першых жанчын ва узбекскім мастацтве. Да яе жаночыя ролі на узбекскай сцэне выконвалі мужчыны. Годы совецкай улады, годы вызвалення жанчыны з'явіліся гадамі бурнага росквіту народнай



творчасці. Сотні і тысячы узбекскіх юнакоў і дзяўчат пацягнуліся да мастацтва. З братняй дапамогай вялікага рускага народа выраслі выдатныя, таленавітыя прадстаўнікі совецкага мастацтва Узбекістана.

Тамара Ханум — выдатная выканальніца песень і плясак народаў СССР. Сапраўднае чуццё мастака дазволіла ёй не толькі ўвасобіць у мастацкіх вобразах быт і культуру узбекскага народа, але і зразумець і ўзняць на высокі ўзровень выкананне песень многіх іншых народаў Совецкага Саюза Уласцівая Тамары Ханум выразнасць і пластычнасць жэсту, мімікі, руху, спалучэнне песні і танца надаюць выкананню кожнага твора, кожнай кампазіцыі яркі і радасны каларыт. Радасць — асноўны матыў выконваемых Тамарай Ханум кампазіцый.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам Тамара Ханум паведаміла:

— Я даўно шукала магчымасці наведаць Совецкую Беларусь. Калі летам мінулага года ў Менск прыехала наша ордэнаносная Дзяржаўная філармонія, я прымушана была выехаць на гастролі ў Ленінград. Нарэшце, мне гэта магчымасць прадставілася. Я вельмі рада, што прыехала ў братнюю рэспубліку, якая даўно вабіла мяне сваімі выдатнымі і радаснымі песнямі. Бо мэта маіх гастрольных паездак не толькі ў тым, каб прадэманстрыраваць песні і пляскі узбекскага народа, але і пераняць ад работнікаў мастацтваў братніх народаў дасягненні народнай творчасці.

У маім рэпертуары акрамя узбекскіх народных песень і плясак ёсць таксама песні і пляскі грузінскага, азербайджанскага, кара-калпакскага, армянскага, таджыкскага, рускага, казахскага, украінскага і яўрэйскага народаў. І вось ужо год, як я ўключыла ў свой рэпертуар некалькі беларускіх песень, падараваных мне народнай артысткай БССР Л. П. Александроўскай.

Тут, у Беларусі, я з вялікай увагай выслухаю ацэнку кваліфіцыраваных слухачоў аб якасці майго выканання беларускіх песень.

Разам са мною ў Менск прыехалі салісты Узбекскай філармоніі — квінтэт у складзе Закірава Дані (выканаўца на узбекскім народным інструменце «гіджак»), бубніста Гафура Саліхова, Кадырава Аюба («най»), Акзамава Каюма («чанг»), Бакаева Сафо («рабоб») і канцэртмейстара С. Е. Швідлер, яна-ж акампаніятар і вядучая праграмы. Ансамбль суправаджае касцюмер-мастак А. С. Колішэва.

У Менску ансамбль дасць тры канцэрты (з іх два закрытых), потым выязджае на некалькі гастролей у Віцебск і адтуль у Ленінград, дзе нам прадстаіць 15 канцэртаў і некалькі канцэртаў у падшэфнай часці на караблі «Марат».

На пытанне аб сваёй бліжэйшай рабоце Тамара Ханум адказала, што зараз яна занята зборнікам песень совецкіх кампазітараў. Ужо ўключаны ў рэпертуар «Мілы мой жыве ў Казані» кампазітара Мокраусава, «Атака Будзённага» Сандлера — на украінскай мове і «Фрэйлехс» — на яўрэйскай мове.

Тамара Ханум праводзіць вялікую работу і як дэпутат Вярхоўнага Совета Узбекскай ССР. Летам 1938 года Тамара Ханум скарыстала свой водпуск для выезду ў калгасы Калінінскага раёна Ташкенцкай вобласці на ўборку бавоўны. Сярод перадавых калгасаў пачалося спаборніцтва на права запрашэння ансамбля да сябе на канцэрт. Гэтым правам карысталіся толькі калгасы, выканаўшыя раней за ўсіх план уборкі бавоўны. За месяц канцэрты Тамары Ханум праслухала 30 тысяч калгаснікаў. Адначасова Тамара Ханум праводзіла агітацыйную работу сярод жанчын, выяўляла таленавітых прадстаўнікоў мастацкай самадзейнасці для арганізуемага калгаснага тэатра. За сваю вялікую работу на ўборцы бавоўны Тамара Ханум атрымала падзяку ад урада Узбекскай ССР.

У заключэнне Тамара Ханум прасіла адзначыць, што узбекская грамадскасць з нецярплівасцю чакае прыезду ў УзССР калектыва Беларускай Дзяржаўнай філармоніі, каб на справе ўпэўніцца ў дасягненнях мастацтва братняй рэспублікі.

П.

ТВОРЧЫ КАНЦЭРТ ХОРА ФІЛАРМОНІІ БССР

У пачатку лютага адбудзецца творчы канцэрт хора Дзяржаўнай філармоніі БССР пад кіраваннем І. Г. Бары. Да канцэрта хор рыхтуе 20 новых твораў — песень народаў Совецкага Саюза, твораў, прысвечаных Шаўчэнка, рэволюцыйных песень і класічных твораў. Сярод аўтараў — кампазітары Шуман, Грыг, Танееў, Каліннікаў, Арэнскі, Глінка, Лядаў, Чэснакоў, Шэйнін, Дунаеўскі, Туранкоў, Шчэглоў, Сакалоўскі, Палонскі, Захаран, Давідэнка і інш.

ДВА СПЕКТАКЛІ

(ДЗЯРЖАЎНЫ РУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР БССР)

Мне хочацца спыніцца на двух спектаклях — «Васса Жэлезнова» М. Горкага і «Прафесар Палежаеў» Л. Рахманава, як характэрных работах Рускага тэатра, дзе выпукла відны адмоўныя ўстановачныя бакі творчасці калектыва.

Родапачынальнік социялістычнага рэалізма М. Горкі з'яўляецца тым цудоўным аўтарам, які дае багаты драматургічны матэрыял для росту актораў. Выбар тэатрам п'есы «Васса Жэлезнова» можна толькі вітаць. Іменна гэты драматургічны шэдэўр М. Горкага найбольш поўна паказвае маральнае падзенне рускага капіталізма і разлажэнне буржуазнай сям'і.

Пастаноўшчык Ю. Н. Рэшымаў у праграме спектакля так сфармуліраваў напрамак пастаноўкі «Вассы Жэлезновай»: «У нашым спектаклі павінны прагучаць тры асноўныя моманты: 1—звярыная прагавітасць і жорсткасць уласніка, 2 — друзласць і бяссілле пратэстуючых (?) і 3 — вера ва ўрачыстасць рэволюцыі».

Што датычыць агульнай фармуліроўкі, што ў «капіталістычным грамадстве чалавек чалавеку — воўк», дык у гэтым сэнсе ў спектаклі, на першы погляд, можа здацца ўсё ў парадку. Васса — драпежная купчыха, яна палісічаму круціцца вакол мужа, калі ён прыходзіць к ёй па яе загаду, і некалькі нервова ўгаварвае яго прыняць атруту.

Гэта мізансцэна вузлавога моманту п'есы — завязкі — урываецца дысанансам у горкаўскі тэкст. Васса—чалавек вялікай волі, жанчына, упэўненая ў свае сілы і настойлівая, не будзе лебязіць перад Сяргеем. Ёй не страшна, што яна атруціць мужа, — Васса пужаецца таго, што суд над Сяргеем зганьбуе яе сям'ю і ўнука. І нервавацца ёй няма чаго, бо перад ёю — п'яніца, распуснік, чалавек для жыцця згублены. Да сустрэчы з Рашэлью Васса свае трывогі ні перад кім не выказвае і нават не паказвае, але, звяртаючыся сама да сябе, гаворыць: «На мяне справы слывуць». Яна прымае нават такі тактычны ход: у гутарцы за чаем спакойна апавядае дамачадцам аб тым, які быў дрэнны чалавек яе муж. Васса лоўка, зноў-такі вонкава, — бо яна падрыхтавана да гэтага, — сустрэла паведамленне служанкі аб смерці мужа.

Глеба з-пад ног Вассы Жэлезновай пачынае выкоўзваць тады, калі яна сустракаецца з Рашэлью. Гэта—самая моцная па ідэйнай накіраванасці і драматургічнай насычанасці сцэна. Пастаноўшчык-жа, асабліва ў другім акце, акцэнтуе сваю ўвагу на бытавым моманце п'есы. У цэнтры спрэчак паміж Вассай і Рашэлью ён ставіць не барацьбу двух класаў, а змаганне за дзіця Рашэлі, якое Васса хоча выхаваць і зрабіць сваім наследнікам. Так трэба разумець усю ігру з лялькай, якую прыносіць сыну Рашэль і якую бяссэнсава цягаюць з рук у рукі актрысы. Гэта перашкаджае разгортванню дзеі і зніжае социяльны змест спектакля. Грубая, бесчалавечая купчыха Васса, як яе следам за рэжысёрам трактуе актрыса Е. Л. Еўгеньева (мы нават не гаворым — волжская купчыха, бо актрыса зрабіла абстрактны персанаж, дзе менш за ўсё мастацкіх дэталей і асаблівасцей прадстаўніка рускай буржуазіі, а больш соцыялогіі), вымушана дакладваць тэкст, як і Рашэль (акт В. Н. Чэркасава), якая то неяк манатонна абараняецца ад грубых паводзін Вассы, то таксама аднастайна, з ілжывым пафасам, нараспеў атакуе Вассу, не адчуваючы гавораных ёю глыбокіх слоў вялікай рэволюцыйнай сілы. У вобразе Рашэлі больш мацярынскай клапатлівасці і менш рысы рэволюцыянеркі. Па вонкаваму выгляду і па ўсіх паводзінах Рашэлі, якія абумоўлены рэжысёрам, у ёй вельмі багата інтэлігенцкіх развагаў і нерашэлеўскай гарачнасці. Калі сцвярджаць гэта, дык, гаворачы словамі пастаноўшчыка, «друзласць і бяссілле пратэстуючых» адносяцца да Вассы і Рашэлі.

Гэта ўжо яўна супярэчыць твору М. Горкага.

Пастаноўшчык трапіў у такое становішча таму, што ён не зразумеў супярэчлівасці вобраза Вассы Жэлезновай. З аднаго боку, яна — чалавек свайго класа, таму ёй уласцівы ўсе асаблівасці рускага капіталізма, з другога — яна жанчына моцнага характару, з вялікай воляй, сілай, розумам, мацярынскім пачуццямі, таму гэта вобраз чалавека з пэўнымі, толькі яму ўласцівымі чалавечымі якасцямі.

У сілу таго, што Васса разумная, яна пратэстуе супроць некаторых маральных устояў свайго грамадства, — жадае, каб губернатар за ёю ўрыльнікі (начныя гаршкі) выносіў, а поп у царкве каб служыў малебны ёй, «чорнай грэшніцы», яна аспрэчвае добрыя адносіны мужа да сябе. Гэтым самым Васса стварае сабе ілюзорную бадзёрасць. Прага ўласнасці, багацця, пашырэння сваёй гаспадаркі робіць яе рабыняй. Гэтаму яна вымушана падпарадкаваць усё сваё жыццё. Гаспадарка зрабіла яе хітрай, а зараз штурхае яе на тое, каб падшукаць сабе наследніка, бо Васса хоча, каб яе справа жыла. Аднак — «... свет багатых людзей разбураецца... разбураецца ўсё, пачынаючы з сям'і...» Пасля гэтага праўдзівага заключэння Рашэлі Васса прапануе ёй жыць у сваёй сям'і. Васса цэніць Рашэль і нават шкадуе, што яна не яе дачка. У яе нянавісці, таксама як і ў яе любві, ёсць штосьці такое каштоўнае і чалавечае, што дае актору вялікі матэрыял для стварэння глыбокага вобраза — вобраза, які павінен стаць у адзін рад з Булычовым, Зыкавым і ім падобнымі персанажамі.

Рашэль — рэволюцыянерка, барацьбіт за праўду. Яна сама ясна сфармуліравала сваю ролю: «...Але нямнога жыцця засталося для такіх, як вы, для ўсяго вашага класа — гаспадароў. Расце другі гаспадар, грозная сіла расце, — яна вас раздавіць. Раздавіць!» Што датычыць дзіцяці, дык зноў-такі справа не ў тым, хто яго возьме. Ясна, што ў спрэчках з Вассай гэта пытанне не вырашыш. Ды і спрэчкі гэтыя, па сутнасці, былі толькі прэдлогам для палітычных размоў. Рашэль у гутарцы з Натальяй сказала, што, магчыма, яна дарэмна нарадзіла дзіця на свет, бо рэволюцыйная справа ёй даражэй за дзіця. Безумоўна, як маці, яна адстойвае сваё права на сына і не жадае, каб яе дзіця выхоўвалася для апраўдання цёмных і брудных спраў купчыхі Вассы Жэлезновай.

Сям'я Вассы і абкружаючае яе асяроддзе — стракатая, прагніўшая група людзей, якія згубілі сваю чалавечую каштоўнасць. Гэтыя людзі дажываюць свой час у стане разгубленасці, разбуранасці, місія дзейнасці іх прыходзіць да свайго лагічнага канца. У такім асяроддзі разумная Васса, безумоўна, не знаходзіць сабе саветчыкаў.

Наперсніца і асабовы сакратар Вассы — Анна (арт. М. Н. Свяцкая) — хатні шпіён, прагны, з тупымі нервамі чалавек (чаго, на вялікі жаль, не зразумела актрыса). Перад такім нізкім чалавекам Васса Жэлезнова не будзе плакаць. Яна толькі выпытвае ў яе, што робіцца ва ўласным доме, але адкрываць душу перад гэтай зводніцай яна не будзе. Таксама не зразумела вобраза Натальі акт. А. В. Меркур'ева. Наталья — не меланхалічная, істэрычная дзяўчына, не «друзлая, бяссільная пратэстантка», як яе трактуюць пастаноўшчык і выканальніца, а чалавек, пратэст якога хоць і не асэнсаваны, але моцны і ў некаторай ступені разбурае сям'ю Вассы. Усёй сваёй істотай ненавідзіць Наталья свой дом, сваю маці Вассу, сястру Людмілу і паважае толькі Рашэль. Але далей гэтага Наталья не ідзе і таму яе пратэст не выходзіць за межы ўласнага дома. Вобраз Натальі некальk і нагадвае Шурку з п'есы «Егор Булычоў». Спачуванне Натальі Рашэлі яшчэ больш паглыбляе вобраз.

Фігура дурненькай Людмілы (арт. А. Б. Рпішчава) была-б куды багацейшай, калі-б не аднастайнасць мізансцэн. Пяцёркін (арт. І. Е. Лісневскі) поўзаннем на каленях апашляецца.

Прахор Храпаў (арт. В. Я. Канаплянскі) — прапойца, нахабнік, які працягвае свае драпежныя лапы да грошай Вассы і ўрэшце становіцца ўласнікам іх, — правільна выконваецца актарам. Але ёсць моманты залішняй камедыйнасці, што хутчэй разлічана на публіку, але ні ў якім разе не выцякае з сутнасці характару Прахора. Смех Храпава — гэта смех чалавека, які смяецца апошнім. Гэта добра. Але сцэна з картамі надуманая, яна адцягвае ўвагу гледача ад актора.

Ансамбля ў спектаклі няма. Кожны актор выконвае сваю ролю так, як яму ўздумаецца.

Афармленне спектакля (мастакі С. Н. Чэрной і І. Л. Фаюткін) зроблена няўдала, не адпавядае стылю горкаўскай п'есы. Над пакоем Вассы нечакана паяўляецца другі паверх, які па ходу п'есы непатрэбен; на сцэне адкрытая веранда, калі ў Горкага напісана, што толькі дзверы вядуць на веранду. Сцэна загружана рознымі рэчамі, але гэта не тыя рэчы, да якіх прызвычаілася Васса.

Адзначаныя недахопы не далі тэатру магчымасці ўскрыць усёй глыбіні філасофскіх ідэй твора Максіма Горкага. Тлумачыцца гэта паспешнасцю і непадрыхтаванасцю як пастаноўшчыка Ю. Н. Рэшымава і маладога рэжысёра Ю. Ю. Трахцеравай, так і большасці выканаўцаў спектакля да такога адказнага экзамена, як пастаноўка п'есы «Васса Жэлезнова».

У процілегласць спектаклю «Васса Жэлезнова» засл. арт. БССР Д. А. Арлоў у пастаноўцы «Прафесар Палежаеў» ішоў па шляху стварэння рэалістычнага спектакля, а не па лініі знаходжання асобных дэталей, упрыгожваючых спектакль. А, між тым, тут больш мастацкіх дэталей, арганічных спадарожнікаў спектакля, чым у папярэдняй пастаноўцы, матэрыял якой даваў большыя магчымасці для творчай фантазіі рэжысёра і актораў.

Спектакль «Прафесар Палежаеў», прысвечан працоўнай інтэлігенцыі, якая аддавала ўсе свае веды і сілы народу і Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі з першых дзён існавання ўлады рабочых і сялян. Гэта ён, прафесар батанікі Дзмітрый Іларыёнавіч Палежаеў, чытаў матросам Балтыйскага флота лекцыі аб жыцці раслін, пісаў для большэвіцкіх газет палітычныя артыкулы, складаў праграмы па адукацыі працоўнага насельніцтва совецкай краіны, клапаціўся аб адкрыцці універсітэта, сустрэў рэволюцыю навуковай кнігай, якую адобрыў В. І. Ленін у якасці падручніка для многіх пакаленняў, вывучаючых батаніку. І самае галоўнае: пастаноўшчык тонка і правільна падкрэсліў у спектаклі, што Палежаеву дапамагае ўвесь совецкі народ, комуністычная партыя і асабіста вялікі правадыр народаў, геній рэволюцыі Уладзімір Ільіч Ленін. Пачуццём клапатаў і пашаны да выдатнага вучонага нашага часу прасякнут увесь спектакль, што робіць яго яшчэ больш каштоўным. Адносіны да інтэлігенцыі, якая ішла ў нагу з рэволюцыяй, былі заўсёды чулыя, як у першыя годы рэволюцыі, так і зараз. Рэжысёр канцэнтрыруе сваю ўвагу на асноўных вобразах п'есы і сваёй любоўнай трактоўкай іх і ўсёй п'есы выклікае ў актораў імкненне да стварэння абаяльных, задушэўных вобразаў нашай інтэлігенцыі. Гэтым самым рэжысёр дамагаецца моцнага акторскага ансамбля.

Цэнтральны вобраз спектакля — прафесар Палежаеў у выкананні засл. арт. БССР Д. А. Орлова набывае вялікае гучанне. Гэта—бязмежны патрыёт навукі, працалюбівы чалавек, грамадзянін свайго часу. Палежаеў цвёрда настойвае, што вучоны заклікан служыць народу. Акторам добра паказана і радасць працы, і любоў Палежаева да свайго вучня Бачарова, і яго настойлівасць у вырашэнні пастаўленых задач. Гэта філігранны вобраз, дзе пачуцці чалавека актор перадае з усёй жыццёвай праўдай. Палежаеву — Орлову шчыра верыш і разам з ім перажываеш усе яго непрыемнасці і ўдачы. Даволі майстэрска ў канву цёплага, разумнага і сапраўды чалавечага вобраза ўплецен старыкоўскі гумар, што ўпрыгожвае Палежаева і яшчэ больш адцяняе яго паслядоўны аптымізм і веру ў свае сілы. І, нарэшце, добра паказана апошняе, што паглыбляе гэты вобраз, — непрымірымая нянавісць Палежаева да ворагаў.

Міша Бачароў — таленавіты вучань Палежаева, які ўвесь заняты грамадскімі справамі і клопатамі аб сваім прафесару, шчыра любіць і паважае свайго настаўніка. Вобраз большэвіка-вучочага, мэтаімкнёны і цэльны, стварыў акт. А. П. Белаліпецкі.

Цікавы вобраз інтэлігентнай жанчыны Марыі Львоўны створан акт. А. Н. Крывенкоўскай. Толькі сцэну з Бачаровым неабходна дапрацаваць, надаўшы сварлівасці Марыі Львоўны больш абаяльнасці.

Характэрная эпізадычная роля кухаркі выконваецца акт. Д. Я. Лейн з мастацкім пачуццём і надоўга застаецца ў памяці гледача.

У спектаклі неабходна дапрацаваць таксама дзве ролі — дацэнта Вараб'ёва (арт. В. Я. Канаплянскі) і матроса Купрыянава (арт. І. М. Позін). Яны ад пачатку да канца аднолькавыя, статычныя, а іх неабходна разгарнуць, паказаць у развіцці

Вырываецца з плана рэалістычнага спектакля і карыкатурная сцэна студэнтаў, якія прыходзяць на кватэру да Палежаева. У гэтай сцэне ўдзельнічае моладзь тэатра, і рэжысёру варта больш папрацаваць з ёю, каб не парушаць цэльнасці мастацкага твора.

Музыка кампазітара Ф. Б. Монтаніякага дачынення да спектакля не мае, за выключэннем тых мясцін, якія неабходны па ходу самой п'есы, таму лепш будзе, калі спектакль будзе выконвацца без музычнага афармлення.

Але гэта дробязі. Спектакль «Прафесар Палежаеў» пастаўлен культурна, рэалістычна і з пачуццём мастацкага густу. Па гэтаму напрамку павінен ісці тэатр, такія спектаклі падымаюць яго аўтарытэт. Новае кіраўніцтва тэатра павінна гэта ўлічыць.

Зараз перад Рускім тэатрам БССР стаяць задачы стварэння спектакляў аб сучасным жыцці Совецкай Беларусі, работы над рускімі класічнымі і лепшымі совецкімі п'есамі і ўдасканаленні акторскага майстэрства.

А. ЕСАКОЎ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку.

Уп. Галоўлітбела № Р—738.